

РОЙ ПЕРАД ЯНАМ — ПЧАЛЯР БУДЗЕ ПАНАМ **8–9**

ВЯРТАННЕ АХОЛЫ — ВЯРТАННЕ СВЯТЛА **13**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 СТУДЗЕНЯ 2022 г. СЕРАДА № 6 (29628)


## КОРАТКА

• Маладзёжны тэлемост па абмеркаванні праекта Канстытуцыі пройдзе ў Гродзенскай вобласці. Удзел у адкрытым дыялогу возьмуць актыў абласной арганізацыі БРСМ, прадстаўнікі працоўнай моладзі, студэнцтва і аўтарытэтныя эксперты.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Мірныя» навагоднія пратэсты ў Казахстане, якія імгненна перараслі ў масавыя пагромы і бясчынствы, наглядна паказалі, што сёння ні адна дзяржава не застрахавана ад знешняга ўмяшання. Тэхналогія кіраванага хаосу, паспяхова выпрабаваная ў розных кутках свету, у тым ліку і ў нас, чарговы раз паказала сваю эфектыўнасць. Сотні забітых, тысячы параненых — гэта далёка не поўны вынік «рэалізацыі дэмакратычных правоў грамадзян на пратэст». А менавіта так ацэньваюць крывавы шабаш у Казахстане прадстаўнікі Захаду. Насамрэч у дружалюбнай нам краіне зроблена спроба дзяржаўнага перавароту, мэтай якога з'яўляліся захоп улады, стварэнне чарговага ачагу напружанасці і супрацьдзеянне інтэграцыйным працэсам на постсавецкай прасторы. Казахстанскі народ пры гэтым разглядаўся ўсяго толькі як разменная манета ў геапалітычнай гульні, а яго інтарэсы ўвогуле не прымаліся пад увагу. Разам з тым у Казахстане ўпершыню для стабілізацыі абстаноўкі быў задзейнічаны механізм прымянення міратворчых сіл АДКБ. Перад тварам знешняй небяспекі прэзідэнт краіны звярнуўся па падтрымку да саюзнікаў, і яна была неадкладна аказана, што стала нечаканасцю як для мяцежнікаў, так і іх заходніх апекуноў. Сёння, ва ўмовах трансфармацыі свету, важныя не толькі ўнутраная стабільнасць, дыялог улады і народа, але і наяўнасць надзейных саюзнікаў, гатовых падставіць плячо ў патрэбную хвіліну. Падзеі ў Казахстане — яркае таму пацвярджэнне».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «МАСТАЦТВА, ТВОРЧАСЦЬ, СПОРТ, ГРАМАДСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПАВІННЫ БЫЦЬ ВЫСОКАМАРАЛЬНЫМІ І СТВАРАЛЬНЫМІ»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўручыў прэміі «За духоўнае адраджэнне». Узнагароды знайшлі і лаўрэатаў спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, і лаўрэатаў прэміі «Беларускі спартыўны Алімп».**

Выступаючы на цырымоніі, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ўзнагароды ўручаюцца на пачатку студзеня невыпадкова. «Светлыя калядныя дні — час дзівосны, напоўнены верай, любоўю і радасцю. Ён аб'ядноўвае людзей, натхняе і дорыць надзею. Таму калі чвэрць стагоддзя назад мы заснавалі прэмію «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльныя прэміі, то свядома прымеркавалі іх уручэнне да Раства. Менавіта гэтае хрысціянскае свята сімвалізуе ўсё самае светлае і чыстае ў нашым жыцці, што нам даваліся дзесяцігоддзямі і стагоддзямі бараніць», — сказаў ён.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, на фоне распаду савецкай дзяржавы каламутнай плынню з Захаду прынесла так званыя дэмакратычныя каштоўнасці, замяшаныя на чужых ідэалах, бездухоўнасці і нізкіх пачуццях. «Падавалася гэта пад выглядам нейкай высокай моды і культуры, а мэта таго экспарту сёння ўсім зразумелая. Трэба было ўзрасціць пакаленне без роду і племені, дыскрэдытаваць паняцце «патрыятызм», прымусіць пагарджаць спадчынай продкаў», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Супрацьпаставіць гэтаму можна было найперш традыцыйную хрысціянскую мараль, маральнасць і найбагацейшую культуру беларускага народа, забяспечыўшы падтрымку людзям, якія гэтыя каштоўнасці абераганоць і развіваюць. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што, не маючы трывалых духоўных апор, наўрад ці беларусы, прайшоўшы праз шматгадовыя войны і пазбаўленні, здолелі б захаваць родную мову, культуру і традыцыі, якія звязалі стагоддзі і пакаленні.



Фота БелТА.

Прэзідэнт уручае прэмію «За духоўнае адраджэнне» протаіерэю, настаяцелю храма іконы Божай Маці «Усецарыца» ў г. Мінску, старшыні Сінадальнага аддзела па царкоўнай дабрачыннасці і сацыяльным служэнні Беларускай праваслаўнай царквы Кірылу ШОЛКАВУ.

«Здавалася б, простыя ісціны, але давайце зазірнём крыху далей за нашы межы. Ці ўсе народы сёння, як мы, жывуць годна, у міры і згодзе? На жаль, не. На дварэ XXI стагоддзе — стагоддзе навукі, прагрэсу і ўнікальных тэхналогій, а сотні мільёнаў людзей у свеце пакутуюць ад войн, хвароб і голаду», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

### Міласэрнасць, чалавекалюбства і сумленне

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў, што ў бурлівым моры перамен беларусам атрымалася абараніць незалежнасць Беларусі, вывесці на новы ўзровень эканоміку, захаваць і развіць сацыяльную сферу. Але самае галоўнае — захаваць сябе, менталітэт, годнасць і чыстую душу беларускага народа, усё тое, што нас аб'ядноўвае і дазваляе з упэўненасцю глядзець у будучыню. «Час паказаў, што наша маладая суверэнная дзяржава ўмее знаходзіць эфектыўныя адказы на любыя выклікі. Пацвярджэнне гэтаму — тое, як мы спраўляемся з ковіднай пандэміяй. Усё, што намі зроблена і робіцца, — выключна для захавання здароўя і жыцця нашых людзей», — сказаў ён.

Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на крызіс на беларуска-польскай граніцы. Паводле яго слоў, гэта паказала, што для беларусаў міласэрнасць, чалавекалюбства і сумленне — не пусты гук. Мы заўсёды гатовы адгукнуцца на чужую бяду. Ён нагадаў непахісныя ісціны: як ты ставішся да чалавека, так і ён будзе да цябе, як ты паважаеш іншыя народы, так і твой будуць паважаць. І з гэтым у беларусаў усё добра.

«Мы падтрымалі гэтых людзей, абагрэлі, далі ім прытулак і хлеб. Яны прыйшлі да нас з мірам, і мы сустрэлі іх з адкрытай душой. Да такіх людзей у нашай чыстай, утульнай, прыгожай, гасціннай Беларусі іншага стаўлення і быць не можа», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Беларускі лідар падкрэсліў, што падобныя падзеі даюць зразумець, наколькі ўразлівы чалавек, калі губляе сувязь з каранямі, з роднай зямлёй. І як важна ў нашым жорсткім свеце берагчы памяць народа, гістарычную праўду, не дапускаць фальсіфікацыі лёсавызначальных для краіны падзей.

СТАР. 2

Сумесны праект "Звязды" і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях

ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

# КАВАРНЫ ЛЁД

## Што трэба ведаць, каб зімовыя забавы не каштавалі жыцця?

**Зімой разам з пухнатым сняжком людзі, як правіла, чакаюць і лёду. Адны, у асноўным дзеці, бяруць цюбінгі ці набітыя сенам мяхі і ідуць катацца з горак. Іншыя спяшаюцца на коўзанку або лыжню. Некаторыя не могуць дачакацца адпаведнага надвор'я, каб пайсці на рыбалку. Добра, калі ўсё гэта прыносіць задавальненне ці карысць. Аднак нярэдка такое баўленне часу каштуе не толькі здароўя, але і жыцця...**

СТАР. 6




ISSN 1990 — 763X

# «МАСТАЦТВА, ТВОРЧАСЦЬ, СПОРТ, ГРАМАДСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ПАВІННЫ БЫЦЬ ВЫСОКАМАРАЛЬНЫМІ І СТВАРАЛЬНЫМІ»

## Ведаць цану міру і перамогі

«Страта карціны гераічнага мінулага вядзе дзяржаву да катастрофы і пазбаўляе народ будучыні. Я рабіў і надалей разам з вамі буду рабіць усё, каб з беларусамі такога ніколі не здарылася. Менавіта таму 2022 год мы аб'явілі Годам гістарычнай памяці», — сказаў Прэзідэнт. Па яго словах, гэта добрая нагода для ўсіх яшчэ раз асэнсаваць тысячагадовы цярністы шлях народа да незалежнасці і ўласнай дзяржаўнасці. Скласці разам усе старонкі нашай няпростай гісторыі: і гераічныя, і трагічныя. Гэта дапамагае вызначыцца з пантэонам нацыянальных герояў, яшчэ раз паглядзець на падручнікі гісторыі, надаць новы імпульс краязнаўству і прадоўжыць работу па захаванні помнікаў архітэктуры. Данесці да свету праўду аб генацыдзе беларускага і іншых народаў на тэрыторыі нашай краіны.

«Мы павінны гэта зрабіць. Найперш для нашых дзяцей і ўнукаў. Яны павінны ведаць цану міру і свабоды, якія здабываліся многімі пакаленнямі потам і крывёй», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

## Ваша праца — выратаванне чалавецтва

Беларускі лідар заўважыў, што беларусы заўсёды па-асабліваму ставяцца да людзей, якія ўмеюць ствараць нешта незвычайнае, што радуе вока і саграве душу. Да тых, хто, не шкадуючы часу, узбагачае культуру, захоўвае гістарычную спадчыну, выхоўвае моладзь. Да такіх, як сённяшнія лаўрэаты. «Справай жыцця вы абралі пачэсны абавязак захоўваць хараство прыроды, чалавечую існасць і культуру. Кожны з вас уносіць адметны ўклад у скарбонку нацыянальных традыцый, мастацтва і асветы нашай краіны. Вельмі важна, што значная частка праектаў, якія сёння адзначаны прэміямі, звязана з захаваннем гістарычнай памяці і фарміраваннем грамадзянскага светапогляду ў юнага пакалення», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Ён не абмінуў увагай тое, што моладзь з дапамогай дарослых актыўна ўдзельнічае ў дабрачыннай і валанцёрскай дзейнасці, займаецца пошукам загінулых герояў вайны, аднаўленнем імён і ўвекавечваннем іх подзвігаў.

«У наш лічбавы век, калі як вялікую мару будучыні вызначаюць бяздушны свет штучнага інтэлекту, а нармальны, жывы дыялог людзей замяняюць сацыяльныя сеткі, вашу працу інакш як выратаваннем чалавецтва не назавеш», — звярнуўся Прэзідэнт да лаўрэатаў.

Разам з прэміямі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльнымі прэміямі па добрай традыцыі ўручаецца прэмія «Беларускі спартыўны Алімп» атлетам і трэнерам, якія праслаўляюць Беларусь на міжнародных арэнах і на ўласным прыкладзе дэманструюць перавагу здаровага ладу жыцця.

«Кожны з вас, паважаныя лаўрэаты, — вялікі талент. Вы сваёй дзейнасцю, сваім жыццём сцвярджаеце простую ісціну: мастацтва, творчасць, спорт, грамадская дзейнасць павінны быць высокамаральнымі і ствральнымі. Вы патрыёты па ўчынках, сапраўдная народная інтэлігенцыя па духу, для якой любоў да Радзімы — перш за ўсё служэнне ёй, жаданне зрабіць родную краіну прыгажэйшай. Вы прыклад для іншых, як разумення таго, што толькі стваральная праца вядзе дзяржаву да росквіту, а прызначэнне грамадзян назаўжды ва ўсе часы — абарона і будаўніцтва Айчыны. Толькі такія справы ўзбагачаюць чалавека і вядуць да вяршынь духу, прымушаюць імкнуцца да святла, несці яго іншым. Наш шлях — умацаванне незалежнасці, клопаты пра надзённае і будучыню, пра захаванне ў чалавеку чалавечага», — звярнуўся да герояў дня Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт пажадаў усім здароўя, дабрабыту, поспехаў ва ўсіх пачынаннях, міру, хатняга цяпла і шчасця!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

### Працаваць дзеля Айчыны

## Лаўрэаты прэміі падзяліліся сваімі ўражаннямі

Прэміі «За духоўнае адраджэнне» ўдастоены **калектыў дзяржаўнай установы адукацыі «Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі горада Брэста»** за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне маладога пакалення, рэалізацыю праекта «Пост Памяці Брэсцкай крэпасці». У гарадской Вахце Памяці штогод удзельнічаюць прадстаўнікі 42 установаў адукацыі Брэста. **Дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» Рыгор БЫСЮК** расказаў, што амаль за 50 гадоў Паста Памяці праз гэтую школу патрыятычнага выхавання прайшлі больш за 97 тысяч юных брастаўчан.

«Пост памяці — у нейкай ступені аблічча Брэсцкай крэпасці. Многія хочуць убачыць, як змяняецца каравул, а як хлопцы і дзяўчаты ганарацца тым, што яны ўвайшлі ў мемарыяльны атрад. У Брэсцкую крэпасць народная сцежка не зарастае, у прамым сэнсе. За мінулы год мы прынялі 383 тысячы наведвальнікаў. Гэта сведчыць аб тым, што людзі ідуць сюды, каб акунуцца ў гісторыю, яшчэ раз прычыніцца да подзвігу абаронцаў нашай Айчыны. Мне як кіраўніку прыемна, што апошнім часам людзі сталі прыходзіць сем'ямі. Лічу, гэта вельмі важны момант», — сказаў ён.

За асаблівыя заслугі ва ўвасабленні ідэй гуманізму, рэалізацыю дабрачынных праектаў, накіраваных на захаванне гістарычнай памяці і традыцый, падтрымку дзяцей, якія пацярпелі ад ваенных дзеянняў, прэмію «За духоўнае адраджэнне» атрымаў **Мясцовы дабрачынны фонд Аляксея ТАЛАЯ.**

«Мая сям'я, мая краіна, дзе магілы маіх продкаў, пасаджаныя разам з бабулямі і дзядулямі дрэвы — усё гэта надае мне сіл ісці наперад, пераадольваць цяжкасці і гароты, дамагацца ўсяго. Я адчуваю неад'емную сувязь пакаленняў, сувязь са сваёй роднай зямлёй. Я як мужчына, як бацька чацвярых дзяцей разумею, што свет глядзіць на нас драпежным поглядам, і мы, як нашы вялікія дзяды і прадзеды, павінны трымаць абарону, умацоўвацца па ўсіх пазіцыях. Нас ніхто не пашкадуе, мы гэта цудоўна разумеем. І нездарма 2021 год, за які мы атрымліваем узнагароду, быў абвешчаны Годам народнага адзінства. Толькі разам мы выстаім, вытрымаем націск знешніх пагроз і прамых інтэрвенцый і зможам далей жыць пад мірным небам, гадаваць сваіх дзяцей і дапамагаць тым, каму зараз нялёгка», — падкрэсліў дырэктар фонду.

Падчас узнагароджання Аляксей Талай падарыў Прэзідэнту зборнік дзіцячых эсэ аб вайне «Жывая памяць удзячных пакаленняў». Выданне на 45 тамоў стала самым вялікім зборнікам дзіцячых эсэ ў свеце.

У 2021 годзе Нацыянальны алімпійскі камітэт арганізаваў спартыўна-культурны фестываль «Вытокі. Крок да Алімпу». За гэтую ідэю **НАК Беларусі** стаў лаўрэатам спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва.

«Мне падаецца, што ідэя фестывалю вельмі своечасовая, і гэта тое, што нам зараз трэба. Фестываль атрымаўся вельмі добры і адкрыты, ён аб'яднаў людзей розных узростаў і інтарэсаў. Што вельмі важна, ён падкрэсліў каштоўнасныя арыенціры нашай дзяржавы, такія як сям'я, здаровы лад жыцця. Думаю, што такога фестывалю нам не хапала. Гэты праект быў запушчаны ў Год народнага адзінства. І мне здаецца, што будзе вельмі сімвалічна, калі ў Год гістарычнай памяці ён паспяхова працягнецца. У нас ёсць ідэі, іх шмат. Трэба сабраць іх разам і зрабіць лепей, чым летась, у нас для гэтага ўсё ёсць», — расказала прадстаўніца арганізацыі **Ксенія САНКОВІЧ.**

Асаблівасць беларускай зямлі ў тым, што таленавітыя дзеячы культуры і мастацтва развіваюцца не толькі ў вялікіх гарадах, але і ў маленькіх населеных пунктах. Спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь атрымалі заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь, узорны тэатр эстрады «Кропелька» Мірскага сельскага Дома культуры з Баранавіцкага раёна. Лаўрэатам стаў і Васіль Казачок, загадчык філіяла № 15 Цэнтра ганчарства вёскі Гарадная, што на Століншчыне.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Прызнанне

# САМАЯ ВЯЛІКАЯ КАШТОЎНАСЦЬ — ГЭТА МІРНАЕ НЕБА НАД ГАЛАВОЙ

## Дзейнасць Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» адзначана прэміяй «За духоўнае адраджэнне»

**Гэта падзяка за значны ўклад у патрыятычнае выхаванне моладзі, увекавечанне памяці абаронцаў Айчыны, рэалізацыю разведвальных пошукавых праектаў «Памяць», «Дняпроўскі рубеж» і «Сожскі рубеж».**



Фота Святланы БАРЫСЕНКІ.

Асабліва выніковымі экспедыцыі былі апошнім часам. Калі за амаль 28 гадоў існавання абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» яго байцамі ўстаноўлена 107 імёнаў, то толькі летась — 17 з іх.

— Пошукі сталі больш плённымі, бо адкрыліся дадатковыя архівы і ў нас з'явіліся больш падрабязныя звесткі аб ходзе баёў і дыслакацыі нашых і нямецкіх войскаў, — удакладняе **кіраўнік клуба ваенны гісторык і пісьменнік Мікалай БАРЫСЕНКА.** — Вайна забрала жыцці мільёнаў чалавек, сотні тысяч з іх лічацца без вестак зніклымі. Імён няма нават у пахаваных. З амаль 330 тысяч чырвонаармейцаў, якія ляжаць у воінскіх пахаваннях Магілёўскай вобласці, вядомы толькі 68 тысяч імён.

Разам з 52-м асобным спецыялізаваным пошукавым батальёнам Міністэрства абароны байцы клуба «Віккру» паднялі і перапахавалі амаль 1,5 тысячы салдат і камандзіраў Чырвонай Арміі. Па ініцыятыве клуба ўстаноўлена 35 помнікаў і памятных знакаў. Апошнім часам пошукавікі шмат працавалі разам з пракуратурай па фактах генацыду на тэрыторыі вобласці.

— З'явіліся новыя даныя пра выпадкі знішчэння мірнага насельніцтва, — падкрэслівае суразмоўнік. — Вельмі ўнікальная ў гэтым сэнсе створана база «Спаленыя вёскі», дзе адлюстроўваюцца ўсе буйныя карныя аперацыі за перыяд вайны. На Магілёўшчыне няма амаль ніводнага населенага пункта, дзе б захопнікі і іх памагатыя не здзекаваліся з людзей.

«Віккруўцы» працавалі і над канцэпцыяй мемарыяльнага комплексу «Памяці спаленых вёсак Магілёўскай вобласці» ў вёсцы Боркі Кіраўскага раёна. Менавіта яны ўстанавілі, што ў 1942 годзе там загінула не 1,8 тысячы, а больш за дзве тысячы чалавек. У гэтым ім дапамаглі рассакрэчаныя нямецкія архівы. Карная аперацыя ў Борках была адной з найбуйнейшых за гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі.

Мікалай Барысенка лічыць, што гэты год вельмі своечасова абвешчаны Годам гістарычнай памяці.

— Гісторыю нельга забываць, бо памяць — падмурак будаўніцтва любой дзяржавы, аснова адзінства людзей, — кажа ён. — Некаторыя з маладых сёння гавораць: «Навошта нам мінулае? Гэта ж так даўно было». Гістарычная памяць — тое, за што трымаецца любое пакаленне. Нельга глядзець у будучыню і не памятаць мінулага. Як толькі мы зоймемся касмапалітызмам і выхаваем чалавека без Радзімы і сцяга — бяры голымі рукамі гэтую краіну. Без памяці нашым дзецям няма на што абаперціся.

— Прызнанне на дзяржаўным узроўні дарагога варта, — адзначыў Мікалай Барысенка. — Дагэтуль мы чыстымі «рэгіяналамі» былі. Магілёўскі аблвыканкам нас заўсёды падтрымлівае, дзякуй вялікі за гэта. Але цяпер мы атрымалі дзяржаўнае прызнанне, нам будзе прасцей працаваць. Ёсць разуменне, што гэта работа патрэбная людзям. А калі так, то гэта патрэбна і дзяржаве.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «ГАЛОЎНАЕ, ШТО ЛЮДЗІ НЕ МАЎЧАЦЬ»

## Эксперты выказаліся на злабадзённыя тэмы

**Эксперты зверылі гадзіннікі ў абмеркаванні важных пытанняў жыцця грамадства і вырашэнні надзённых праблем беларусаў. На базе інфармацыйнага агенцтва «Мінск-навіны» прайшло чарговае пасяджэнне «Дэпутацкага клуба», першае ў новым годзе. Як заўважыў мадэратар сустрэчы генеральны дырэктар агенцтва «Мінск-навіны» Андрэй КРЫВАШЭЕЎ, сустрэча прысвечана абмеркаванню самых актуальных тэм.**

Натуральна, без увагі ўдзельнікаў дыскусійнай пляцоўкі не засталася самая важная на сёння агульнанацыянальная тэма — падрыхтоўка да правядзення Канстытуцыйнага рэферэндуму і тыя грамадскія абмеркаванні, якія праводзяцца па ўсёй краіне.

Андрэй Крывашэеў звярнуў увагу, што людзі актыўна абмяркоўваюць праект змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю. І, што цікава, у кожнай сацыяльнай групы свае пытанні і інтарэсы. «Працоўныя калектывы больш цікавяць сацыяльныя пытанні, устойлівасць і стабільнасць эканомікі, арэнднае жыллё, пытанні аховы здароўя, захаванне гістарычнай памяці. «Але чым маладзейшая аўдыторыя, з якой размаўляеш, тым больш палітызацыі тэмы Канстытуцыі. Моладзь цікавяць пытанні пераходных палажэнняў, Усебеларускага народнага сходу, дзейнасці Прэзідэнта, парламента, мясцовай улады», — падкрэсліў ён.

**З Андрэем Крывашэевым пагадзілася і начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА.** Яна акцэнтавала ўвагу на важнасці дыялогавых пляцовак для агульнага абмеркавання змяненняў у Канстытуцыю. «Калі мы толькі пачалі праводзіць дыялогавыя пляцоўкі, галоўным пытаннем было: навошта ўносіць змяненні ў Канстытуцыю? На наступнай пляцоўцы людзі ўжо цікавіліся, чаму, напрыклад, паўнамоцтвы паміж Прэзідэнтам і парламентам раздзяляюцца менавіта такім чынам, а не іншым. Працоўныя калектывы больш абмяркоўваюць сацыяльныя пытанні, іх хвалюе захаванне сямейных каштоўнасцяў. На сваіх сустрэчах я магу сказаць, што моладзь цікавіцца палітычнымі пытаннямі. Нават цытуюць, зачытваюць некаторыя артыкулы. Тое, што ў насельніцтва ёсць заклапочанасць змяненнямі Канстытуцыі, гэта відавочна, у гэтым нават не даводзіцца сумнявацца», — заявіла яна.

Па словах Вольгі Чамаданавай, самае галоўнае, што людзі не маўчаць і не саромеюцца выказвацца. Яна прывяла прыклад грамадскіх прыёмных, якія пачалі працаваць 30 снежня. І, нягледзячы на навагоднія святы, людзі ішлі ў першую чаргу з пытаннямі і прапановамі, а не скаргамі ці асабістымі зваротамі. «Як толькі пачынаеш казаць, што час дыктуе, што Асноўны Закон краіны павінен прайсці праз змены, людзі пераключаюцца на падзеі 2020 года. Вельмі шмат увагі засяроджана на тых падзеях. Напрыклад, у сувязі з гэтым многія факусіруюцца на гарантаванні інфармацыйнай бяспекі, захаванні персанальных даных. Самае галоўнае, што ўсе нашы дэпутаты, палітолагі ўцягнуты ў работу з насельніцтвам і ніхто не адмаўляе людзям у адказах на іх пытанні», — падкрэсліла начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей СІВЕЦ** звярнуў увагу, што людзей у большай ступені хвалююць змены, звязаныя з рэалізацыяй канстытуцыйных правоў і свабод. Асабліва — правоў і свабод, якія датычацца сацыяльна-эканамічнай сферы. «І ў гэтым плане хацелася б нашых грамадзян супакоіць. Агульнасусветныя стандарты не толькі захоўваюцца ў аўтэнтычным выглядзе, у якім увайшлі ў Канстытуцыю ў 1994 годзе, больш за тое, яны пашыраюцца з улікам напрацаванай за чвэрць стагоддзя правапрымяняльнай практыкі, у тым ліку на канстытуцыйна-прававым узроўні, у частцы пашырэння сацыяльных гарантый», — заявіў ён.

### ГЭТА НОВАЯ ФОРМА БАРАЦЬБЫ З ДЗЯРЖАВАЙ

**Кіраўнік Аналітычнага цэнтра EcooM Сяргей МУСІЕНКА** заявіў, што стаўленне беларусаў да змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю змянілася пасля падзей у Казахстане: «Людзі зразумелі, што ўносіць змены і прапановы ў дакумент лепш, чым мець пасля спаленыя машыны і разбітыя вітрыны. Гэта як прышчэпка. Той жах, які мы бачым у Казахстане, мог быць і ў нас, мы былі на мяжы. Таму не варта расслабляцца, падзеі ў Казахстане павінны нас ацверазіць і мабілізаваць».

Па словах Андрэя Крывашэева, падзеі ў Казахстане не могуць пакінуць беларусаў безудзельнымі. «Гэта спроба дзяржаўнага перавароту, гэта не вывучаная, на жаль, Казахстанам беларуская ўрокі 2020 года. Мы павінны зрабіць высновы з гэтых крывавых і трагічных падзей нашага саюзніка. Тым больш што Беларусь адправіла туды частку міратворчага кантынгенту ў складзе міратворчых сіл АДКБ», — заявіў ён.

Падрабязна аб сітуацыі ў Казахстане выказаўся **аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў, аналітычны аглядальнік Аляксей АЎДОНІН.** Паводле яго слоў, тое, што адбываецца цяпер у Казахстане — зусім не вынік сацыяльнага канфлікту, выкліканага павышэннем цэн на газ. Гэта не аксамітная рэвалюцыя, не мірныя пратэсты, а дзеянні высокаарганізаваных тэрарыстычных груповак, арыентаваных на хуткі, вокамгненны захоп асноўных гарадоў, ключавых цэнтраў, лагістычных вузлоў. «Гэта сведчыць аб тым, што на Казахстане былі апрабаваны новыя тэхналогіі захопу ўлады. Калі б гэтыя тэхналогіі былі выкарыстаны ў нас ці ў іншай постсавецкай краіне, вынік быў бы зусім іншы. Тыя, хто распрацоўваў спецаперацыю ў Казахстане, улічылі вопыт і з сітуацыяй у Беларусі ў 2020 годзе, і ўкраінскі, і іншых аксамітных рэвалюцый на постсавецкай прасторы. Гэта новая форма барацьбы з дзяржавай і ўстанаўлення кантролю над тымі ці іншымі тэрыторыямі. І ў дадзеных умовах важна забяспечыць такі механізм кіравання дзяржавай, які б пры любых абставінах мог выстаяць, утрымаць уладу», — растлумачыў ён.

### АСНОЎНАЯ МЭТА — КАМФОРТ ГРАМАДЗЯН

Цікавай тэмай для абмеркавання экспертамі стала кватэрнае пытанне, якое мінчан не сапсавала, але хвалюе. «Нядаўна быў прыняты бюджэт горада, а таксама прайшлі дзве нарады на ўзроўні Прэзідэнта, дзе абмяркоўвалася развіццё сталіцы з пункту гледжання архітэктуры, транспарту, жылля для патрэбы, развіцця гарадоў-спадарожнікаў», — падкрэсліў Андрэй Крывашэеў. Удзельнікі «Дэпутацкага клуба» абмеркавалі камфортнасць пражывання жыхароў сталіцы, стан аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры і іншыя аспекты горадабудаўніцтва. «Ёсць выразная стратэгія развіцця гарадскіх тэрыторый да 2030 года. Асноўная мэта ўлады ў гэтым кірунку — камфорт грамадзян. Мы ставім перад сабой дзве задачы: забяспечыць зручнасць у месцы пражывання (мікрараёнах) і камфорт перамяшчэння гараджаніна да працоўнага месца. Што да першай пазіцыі, то будзе яшчэ раз праведзена ацэнка размяшчэння сацыяльных аб'ектаў — дзіцячых садкоў, школ. Калі раней горадабудаўнічы падыход быў прапісаны нарматывам (так званая крокавая даступнасць гэтых аб'ектаў у межах 500 м), то зараз ад гэтай катэгорыі будзем адыходзіць, таму што мяняецца паняцце крокавай даступнасці. Мабільнасць насельніцтва павысілася настолькі, што крокавая даступнасць ацэньваецца ўжо не адлегласцю, а часам да прыбыцця ў той ці іншы пункт. Вось гэтую адзнаку мы правядзём і занясём яе ў генплан, які абнаўляецца. Магчыма, таму памяняюцца арыенціры па будаўніцтве дзіцячых садкоў і школ, іх размяшчэнні. Другая пазіцыя — час прыбыцця на працоўнае месца. Калі ацэньваць так, як гэта робіцца ў свеце, то камфортным лічыцца час прыбыцця ад дома на работу за 35—40 хвілін або да 1,5 гадзіны, калі пражываеш у іншым населеным пункце. З гэтага і будзем зыходзіць», — расказаў **першы намеснік старшыні Мінгарвыканкама Дзмітрый МІКУЛЁНАК.** Таксама ён звярнуў увагу на арэнднае жыллё, якое для многіх з'яўляецца эфектыўным спосабам вырашэння жыллёвага пытання. Паводле яго слоў, арэндныя дамы ў Мінску працягнуць будаваць, але з нававядзеннямі. «Па рашэнні гарадскіх улад прыярытэтна на такое жыллё могуць прэтэндаваць настаўнікі, медыкі, ваенныя. У большасці будзем выдзяляць арэндныя кватэры ў пэўных дамах па ўсім горадзе, каб было зручна дабірацца на працоўнае месца дадзеным катэгорыям спецыялістаў. Пункты забудовы вызначаны, яны знаходзяцца ў кварталах жылой забудовы ў Кастрычніцкім, Фрунзенскім, Маскоўскім раёнах, у далейшым будуць разглядацца Першамайскі і Партызанскі», — сказаў Дзмітрый Мікулёнак.

**Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Ігар КАМАРОЎСКІ** заявіў, што дзяржава дабілася сур'ёзных поспехаў у будаўніцтве сацыяльнага жылля. «Разам з тым, калі жыхары сталіцы хочуць пабудаваць камерцыйнае жыллё, то некаторыя з іх сутыкаюцца з нядобрасумленнымі забудоўшчыкамі. І як у гэтым выпадку абараніць гараджан ад даўгабудаў, як застрахаваць людзей, якія ўступаюць у долевае будаўніцтва, — гэта вельмі сур'ёзнае сацыяльнае пытанне», — сказаў ён.

Удзельнікі «Дэпутацкага клуба» закранулі і фарміраванне Мінскай агламерацыі і тэрыторыі, якія могуць у яе ўвайсці. У прыватнасці, вялікі інтарэс выклікала пытанне аб наданні пасёлку Бараўляны статусу горада. Дзмітрый Мікулёнак заўважыў, што калі разглядаць Мінск як ядро агламерацыі, то Бараўляны для сталіцы не з'яўляюцца нейкім прывабным кавалкам, бо там ужо ўсё сфарміравалася і ўплываць на гэтую тэрыторыю сталічныя ўлады не могуць.

### ВАКЦЫНАЦЫЯ АБАРОНІЦЬ

Не засталася без увагі ўдзельнікаў «Дэпутацкага клуба» тэма вакцынацыі падлеткаў ад каранавіруснай інфекцыі, якая праводзіцца ў краіне. **Дэпутат Мінгарсавета, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Ленінскага раёна — галоўны ўрач Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ленінскага раёна Віктар ЖУКОЎСКІ** падкрэсліў, што вакцынацыя — важная частка барацьбы з ковід-інфекцыяй. Пры гэтым, для таго каб атрымаць добры эфект ад прышчэпачнай кампаніі, трэба вакцынаваць як мага больш людзей, асабліва з уразлівых груп. «Вакцынацыя ад каранавіруса абароніць ад цяжкіх ускладненняў. Гэта галоўнае. І дзяцей прывіваць трэба. Цяпер вакцынуем 12—17-гадовых, а ў перспектыве, магчыма, будзем прышчэпліваць і ў больш малодшым узросце. Як ад грыпу (прышчэпліваюць з 6 месяцаў. — **Заўв. аўт.**)», — сказаў эксперт.

Віктар Жукоўскі заявіў, што беларуская мадэль барацьбы з каранавіруснай інфекцыяй даказала сваю эфектыўнасць. Па яго словах, рана ці позна ковід будзе пераможаны, як грып, які стаў сезонным захворваннем.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## Прыходзьце з прапановамі!

**Наталля Качанава зноў возьме ўдзел у рабоце грамадскай прыёмнай пры Савеце Рэспублікі.**

Такім чынам, адбудзецца другі прыём грамадзян на гэтым тыдні спікерам верхняй палаты парламента, мэта якога — абмеркаванне праекта новай Канстытуцыі.

Як растлумачылі ў прэс-службе Савета Рэспублікі, працягвае сваю дзейнасць грамадская прыёмная пры Савеце Рэспублікі па абмеркаванні змяненняў і дапаўненняў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Члены Савета Рэспублікі гатовыя асабіста выслухаць усіх, у каго ёсць прапановы па праекце Асноўнага Закона, і адказаць на пытанні, якія хвалююць грамадзян, па адрасе: **г. Мінск, вул. Кірава, 47.**

Сустрэчы праходзяць **па панядзелках, серадах і пятніцах кожны тыдзень.**

Так, **у пятніцу, 14 студзеня, з 9.00 да 12.00** з грамадзянамі зноў сустрэнецца **Старшыня Савета Рэспублікі, намеснік старшыні Канстытуцыйнай камісіі Наталля КАЧАНАВА.** Пасля прыём прадоўжыць — **з 12.00 да 17.00 — старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, член Канстытуцыйнай камісіі Сяргей СІВЕЦ.**

У прэс-службе звярнулі ўвагу, што ў сувязі з вялікай колькасцю жадаючых звярнуцца да членаў Савета Рэспублікі сустрэчы з грамадзянамі будуць праводзіцца па папярэднім запісе. Запісацца можна **па тэлефонах: 8 (017) 321 22 98, 327 46 74, 327 46 76.**

## ДАСЛОЎНА



**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА** паўдзельнічаў у дыялогавай пляцоўцы па абмеркаванні праекта змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце. Пра гэта паведамляе БелТА.

«Бачым актыўны інтарэс да тэксту змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю. Яго праяўляюць розныя катэгорыі грамадзян і ў вёсцы, і ў горадзе. На сёння ад насельніцтва паступіла больш за чатыры тысячы водгукаў, зваротаў, пэўных прапаноў адносна праекта. Цэнтр прававой інфармацыі штодня аналізуе інфармацыю, што паступае, займаецца яе абагульненнем. Ёсць канкрэтныя цікавыя прапановы, якія будзем разглядаць на пасяджэнні рабочай групы і Канстытуцыйнай камісіі. Пераважае колькасць водгукаў у падтрымку праекта Канстытуцыі, ёсць і адмоўныя, дзе ўзамен нічога не прапаноўваецца», — сказаў Ігар Сяргеенка.

Найбольш высокая цікавасць з боку насельніцтва заўважная да артыкулаў, звязаных з сацыяльнай палітыкай, адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. Грамадзян хвалюе, ці захаваюцца асноўныя арыенціры дзяржавы. Разам з гэтым людзі праяўляюць цікавасць і да функцый і паўнамоцтваў Усебеларускага народнага сходу.

**Калі ў вас з'явяцца меркаванні з нагоды праекта — пішыце ў рэдакцыю або непасрэдна ў арганізацыю, якая будзе акумуляваць і аналізаваць усе заўвагі і прапановы, — Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі. Можна скарыстацца электроннай поштай sbor@ncpi.gov.by; можна запоўніць электронную форму, якая маецца на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале па адрасе: https://sbor.pravo.by; можна даслаць па пошце на адрас: 220030, г. Мінск, вул. Берсана, 1А, НЦПІ, з пазнакай «Канстытуцыя».**

# «ЦЯПЕР НАДЫХОДЗІЦЬ ЧАС БЕЛАРУСЫ МОГУЦЬ

**З палітолагам Кірылам КОКТЫШАМ, кандыдатам палітычных навук, дацэнтам кафедры палітычнай тэорыі МДІМА МЗС Расіі, мы размаўлялі... вядома, пра палітыку. Пра тэорыю і практыку, пра звычайныя сёння рэчы, у якіх гэта самая палітыка жыве і кіруе людзьмі, а людзі пра тое і не здагадваюцца. Пра падзеі ў Беларусі (яму згаданая тэма не чужая, ён нарадзіўся і вучыўся ў Мінску, ды і сёння жыве фактычна на дзве краіны). Пра міжнародны парадак дня, пра глабальныя інтарэсы асноўных гульцоў. Пра нашае месца ва ўсім гэтым крутым замесе. Гутарка адбылася на мінулым тыдні, якраз перад тым, як пачаліся масавыя беспарадкі ў Казахстане.**

**Але слухаючы дыктафонны запіс, я лавіла сябе на тым, што навіну аб падзеях у Алматы мы падчас размовы ўжо чулі. Зрэшты, дзіўнага ў тым нічога няма: паўсюль працуюць ужо апрабаваныя тэхналогіі, дадаецца толькі «нацыянальны каларыт» — і пра гэта мы гаварылі таксама, як і пра вечнае «каму гэта патрэбна».**

**Размова атрымалася няпростая, і для ўспрымання, магчыма, падасца камусьці складанай. «Для 88 працэнтаў любога грамадства палітыка — гэта не сфера дзейнасці, а сфера, якой карыстаюцца. Гэта як з ліфтам: калі да вас падыдзе чалавек і пачне тлумачыць яго ўладкаванне, вы будзеце яго ўважліва слухаць? Наўрад ці — вам галоўнае, каб ліфт прывёз вас на патрэбны паверх», — растлумачыў мне суразмоўнік.**

**І ўсё ж, можа, для многіх з нас настаў час пацікавіцца хоць трохі, як працуе гэты ліфт, на якім мы едзем. Хоць бы дзеля таго, каб замест пентхауса ўрэшце не апынуцца на цокальным паверсе...**

**Гэта нават не цалкам інтэрв'ю, бо падрыхтаваныя пытанні тут не спрацавалі б. Хутчэй разважанні спецыяліста на тую ці іншую тэму і пытанні журналіста дзеля ўдакладнення, якія разам з чытачом спрабуе разабрацца ў тым, што адбываецца і хто за гэтым стаіць.**



## Сацыяльныя сеткі і новыя тэхналогіі. З рэвалюцыянера за тры месяцы можна зрабіць кансерватара. І наадварот

— Мы жывём у складаны час, бо з інтэрнэтам мы перайшлі ў іншую эпоху. Наяўнасць інтэрнэту і сённяшніх эфектаў сацыяльных сетак прыводзіць да таго, што можна казаць аб з'яўленні кагнітыўнага суверэнітэту — суверэнітэту мазгоў, грамадскіх думак, настрояў. І беларускія падзеі 2020-га паказалі, што гэты суверэнітэт вельмі істотны. Кантроль над грамадскай свядомасцю, светапоглядам, настроямі абсалютна рэальна можа апынуцца ў знешняга гульца, які мае свае эгаістычныя матывы. «Вішанькай на торце» стала публікацыя Амерыканскай акадэміі навук аб праекце PEACH, які доўжыўся пяць гадоў і даследаваў магчымасць «перапраграмавання» чалавека. У ім узялі ўдзел пяць сур'ёзных універсітэтаў ЗША і Еўропы, «на выхадзе» атрымалася праграма для смартфона, якая спрыяе «асабаснаму росту», «выпрацоўцы лідарскіх якасцяў» і гэтак далей. На другім баку — нават не чалавек, а бот, які аперыруе тыпавымі псіхалагічнымі профілямі. Карыстальнік праграмы, выконваючы заданні, да непазнавальнасці мяняўся на працягу трох месяцаў, прычым у 90 працэнтах выпадкаў.

***— У які бок?***

— На этапе выпрабаванняў — у той, які «заказваў», але насамрэч — у той, які патрэбен тым, хто стварае праграму. З рэвалюцыянера за тры месяцы можна зрабіць кансерватара, з халерыка — меланхоліка і наадварот...

***— Гэта ж нейкі Оруэл...***

— Лепш сказаць, гэта скрыня Пандоры, бо для буйных карпарацый гэта непераадольная спакуса скарыстацца такім новым ноу-хау, бо можна сэканоміць каласальныя сродкі на рэкламе, запраграмаваўшы лаяльнасць да прадукту непасрэдна. А для дзяржавы, перш-наперш — амерыканскай, бо гэтыя напрацоўкі — як ўласнасць, гэта таксама непераадольная спакуса кантраляваць і свайго, і знешняга выбаршчыка. Галоўная ўмова ўздзеяння і эфектыўнасці падобных тэхналогій — чалавек павінен лічыць сябе незалежным і самадастатковым. ***Калі ў чалавека дамінуе індывідуальная ідэнтычнасць — ён бачыць сябе найперш як асобу, як індывідуума, то ён гранічна маніпулюемы.***

***— Парадокс: чым больш ты незалежны, тым больш залежны...***

— Так. Гэты парадокс у паліталогіі называецца парадокс Мішэля Фуко, ён адкрыў яго з'яўленне з пачатку Новага часу. Калі коратка: ***калі хтосьці гаворыць вам пра свабоду і незалежнасць, хутчэй за ўсё, менавіта гэта ён і збіраецца ў вас забраць, калі гаворыць аб гуманнасці — хутчэй за ўсё, яе стане нашмат менш...***

***— Але раней з меншай хуткасцю перадачы інфармацыі і з адсутнасцю сённяшніх тэхналогій тое было рабіць больш складана...***

— Можна было заўсёды. Маклюэн, які прыдумаў тэорыю «гарачых» і «халодных» сродкаў камунікацыі, згадвае такі выпадак з гісторыі. Місіянеры ніяк не маглі ўзламаць племянную структуру аўстралійскіх абарыгенаў, у якіх важнай часткай сацыялізацыі была каменная сякера. Як толькі хлопчык уласнаручна мог яе зрабіць, ён станавіўся мужчынам — адпаведна, набываў у племені правы і статус... Місіянеры ўзялі і раздалі вострыя металічныя сякеры жанчынам і дзецям. Гэтага было дастаткова, каб уся племянная іерархія, уся векавая сістэма разбурылася. І ўжо можна было з лёгкасцю ўкараняць новую ідэалогію і рэлігію...

***— Такое ўражанне, што ад абарыгенаў мы недалёка адышлі. Бо летам 2020-га людзі «вяліся» на самыя прымітыўныя «ўкіды», часам на мяжы абсурду...***

— У выпадку палітычных навін — чалавек запамінае толькі першае паведамленне: няважна, наколькі яно праўдзівае або абсурднае. Бо ён інфармацыяй карыстаецца — памятаеце, з чаго мы пачалі? І калі далей з усім разбірацца і расказваць, як яно ёсць насамрэч, ён проста патоне ў патоку інфармацыі, бо ён усяго толькі чытач.

***— А калі наступная інфармацыя будзе праўдзівая, дэталёвая, з доказамі?***

— Для экспертаў гэта спрацуе, для шырокай публікі — не.

***— Значыць, усё-ткі справа ў хуткасці?***

— Не толькі. Справа ў адказнасці. На самай справе ***любой сацыяльнай сетцы фэйкавыя навіны выгадныя.*** Любая спрэчка, любы канфлікт на старонках нараджае палярызацыю — адпаведна, наведвальнасць... Вядома, што ў трыццаці працэнтаў дзяўчат, якія зарэгістраваны ў «Інстаграме», з'яўляецца комплекс непаўнацэннасці: яны пачынаюць лічыць сябе непрыгожымі, тоўстымі і г. д. «Фэйсбук», набыўшы «Інстаграм», ведаючы гэта, не стаў рабіць нічога, каб нешта змяніць. Чаму? Таму што закамплексаваны чалавек — найлепшы пакупнік, яму тут жа, на гэтай жа платформе, можна прапанаваць «надзвычай танна» купіць сродкі ад яго комплексаў...

Што датычыцца спрэчак у віртуальнай прасторы. Так званы эфект сацыяльных сетак, пра які сёння гаворым, апісаў... Джонатан Свіфт у васямнаццатым стагоддзі. Памятаеце, у яго «Падарожжах Гулівера» ёсць гісторыя пра партыі востра- і тупаканечнікаў — палітычныя праціўнікі разыходзяцца ў тым, з якога боку — вострага ці тупога — разбіваць яйка. Насамрэч большасць людзей разбівае яйка пасярэдзіне. Але ж гэта нецікава, і партыі такой няма. Важныя спрэчка і канфлікт — гэта прыцягвае ўвагу... ***У сацыяльнай сетцы з цэнтрысцкай пазіцыяй быць неэфектыўна, а вось калі ты прытрымліваешся радыкальных поглядаў — ты атрымліваеш найбольшую колькасць «лайкаў», падпісчыкаў, а значыць, далей можаш капіталізаваць сваю пазіцыю — калі прасцей, атрымаць за гэта грошы.*** У 2018 годзе на «Фэйсбуку» быў уведзены алгарытм MSI, meaningful social interactions, які дзейнічае на старонцы так. Калі вы нейкай публікацыі паставілі «лайк» — гэта плюс адзін шанц, што яна з'явіцца ў стужцы навін вашых сяброў. Калі вы пакінулі злы смайлік, «дызлайк» — плюс пяць. Калі каментарый — плюс пятнаццаць, а калі каментарый і «рэпост» — плюс трыццаць. Так што больш выгадна рабіць пасты якія? Правільна — скандальныя. Узнікае своеасаблівая варонка — чым больш падобных пастоў, тым больш абмеркаванняў, спрэчак, тым больш зацягваецца ў яе карыстальнікаў... Выйграе найперш сацыяльная сетка — расце колькасць карыстальнікаў і, адпаведна, колькасць пакупнікоў.

Дарэчы, калі стваральнік «Фэйсбука» Цукенберг паспрабаваў прасунуць ідэю ўсеагульнай вакцынацыі ад ковіду праз дадзеную сетку — не атрымалася.

***— Чаму?***

— Таму што «Фэйсбук» «затачаны» пад спрэчкі. Пад тое, што спараджае раскол і канфлікт. І павярнуць назад не атрымалася нават у стваральніка...

***— Вось калі б вакцыны прадаваліся, а не былі бясплатнымі...***

— Так. ***Мэта ў сацыяльных сетак — не ўсеагульнае маніпуляванне, а прасоўванне нейкіх ідэй для пэўных груп. Размова ідзе аб таварнай прывязцы — карпарацыям патрэбныя пакупнікі. Пасля можна ісці з гэтым у палітыку, у іншыя сферы. Але спачатку заўжды на чале стаяць тавары, якія гэтая сетка (ці карпарацыі праз яе) прадае, з тым разуменнем, што таварам можа быць і ідэя (імідж), спосаб жыцця...***

***— Значыць, калі ты прысутнічаеш у сацсетках, ты рана ці позна радыкалізуешся ў той ці іншы бок?***

— Калі ты не разумееш, у чым справа, то так.

***— А калі разумееш — табе там рабіць няма чаго?***

— Або ты разумееш і на гэтым зарабляеш, прычым асэнсавана, або разумеючы, не «вядзешся» на тэхналогіі...

***— Але ж гэта сумна...***

— Ну, можна выбіраць сваіх: каго чытаць, каго глядзець. У гэтым жа і быў першапачатковы сэнс сацыяльных сетак...

## Падзеі ў Беларусі летам 2020-га. Прычым тут Вудра Вільсан?

— Звычайна эфект натоўпу дастаткова просты: нейкая колькасць людзей уводзіцца ў эмацыянальны шок — ці захаплення, ці абурэння. Як правіла, натоўп існуе, пакуль жывая гэтая эмоцыя. Існуе і рацыянальны цэнтр натоўпу, які бярэ на сябе функцыі тлумачыць, што адбываецца. Каб натоўп існаваў на эмацыянальным зарадзе не дзень, не два, а больш доўгі перыяд — гэта было, бадай, першы раз. І дапамаглі тут менавіта новыя тэхналогіі. Рацыянальны ж цэнтр быў знешні — польскі тэлеграм-канал, прызнаны сёння экстрэмісцкім. Чаму ён спрацоўваў? Прымітыўна тлумачыў тое, што адбываецца.

***— «Тлумачыў» — моцна сказана.***

— Але ён выконваў сваю рацыянальную функцыю згодна з тэхналогіямі. І вёў да дасягнення патрэбнай знешнім кіраўнікам мэты.

Тут яшчэ такі момант. У Беларусі вельмі добрая тэхнічная адукацыя, а для людзей з такой адукацыяй, з такім складам розуму ўсе складаныя палітычныя працэсы — проста механіка, даволі літаральна перанесеная са свету фізічнага ў свет сацыяльны, са свету рэчаў у свет людзей. А яшчэ ў падзеях 2020 года былі заўважныя ІТ-спецыялісты і нацыяналісты. І тыя, і тыя натхняюцца звонку. Што датычыцца ІТ-сектара. Для іх у Беларусі створаны выдатныя ўмовы, але недастаткова ўласных рынкаў. Не сакрэт, што ***большасць прадстаўнікоў ІТ-бізнесу працуе на амерыканскія кампаніі. А «дзе маёмасць твая, там і сэрца тваё», ды і заказчык заўсёды можа задаць умовы, пры якіх ваш прадукт будзе ім заказвацца, а пры якіх — не.***

***Што датычыцца нацыяналістаў — іх, і не толькі беларускіх, ЗША падтрымліваюць заўсёды.*** Чаму? У пачатку XX стагоддзя амерыканскі прэзідэнт Вудра Вільсан пачаў выбудоўваць палітыку паводле аднаго з заснавальнікаў ЗША Аляксандра Гамільтана, які сфармуляваў прынцып, што велічыня эканомікі мае значэнне. Малая эканоміка мае нізкую тэхналагічную «столь», яна не можа ні зрабіць высокатэхналагічныя рэчы, ні іх акупіць: у вёсцы ніхто не будзе праводзіць метро. Тады ж быў сфармуляваны тэзіс, што еўрапейскія абставіны (а гэта — падзел Еўропы на нацыянальныя дзяржавы) ніякім чынам не павінны паўтарыцца ў ЗША — Штаты

# СФАРМУЛЯВАЦЬ: А ШТО — НАША. І ПАВІННЫ ГЭТА ЗРАБІЦЬ»

павінны быць імперыяй, здольнай «еўрапейскімі абставінамі» карыстацца. І ўжо ў 1919 годзе Вудра Вільсан заяўляе, што любая імперыя — гэта турма народаў (ЗША, вядома, на ўвазе не меліся). Еўрапейскія імперыі зусім не ў апошнюю чаргу намаганнямі Штатаў былі літаральна «парэзаныя» на нацыянальныя дзяржавы, працэс быў названы «Вясна народаў», а яго завяршэнне аформлена ў Лігу Нацый. Эканамічная мэта для ЗША была даволі простая: скарыстацца выгодамі сваёй спраўджанай індустрыялізацыі, адначасова прадухіліўшы працэсы ўласнай індустрыялізацыі ва Усходняй Еўропе. Гэта і атрымалася: ЗША надоўга сталі для ўсёй Еўропы тэхналагічным донарам, і ў першую чаргу — для малых краін, якія, як сказаў Гамільтан і вельмі добра зразумеў Вільсан, надта малыя, каб ствараць уласныя тэхналогіі.

***— Дык прычым тут нацыяналісты і чаму Штаты іх падтрымліваюць яшчэ з тых часоў?***

— Паводле дактрыны Вільсана, ***нацыяналісты ў індустрыі нічога не разумеюць: ні адна нацыянальная культура Усходняй Еўропы не мае індустрыяльнага досведу. Яны ўсе фарміраваліся ў аграрную эпоху, таму нацыяналісты будуць займацца «вяртаннем да вытокаў» і супрацьстаяннем з нацыяналістамі суседніх краін, не перашкаджаючы кіраваць эканомікай замежным уласнікам, якія, скажам так, у ёй разумеюць крыху больш... Што дазволіць яшчэ больш паспяхова развіваць сваю эканоміку... краіне, якая падтрымлівае нацыяналістаў у іншых дзяржавах.***

***— Але ж гэта было сто гадоў таму — Вільсан і яго палітыка. А гаворым, нібы пра сёння..***

— Так, ніхто не думаў, што напрацоўкі стагадовай даўнасці сёння спатрэбяцца. Дарэчы, СССР здолеў пераскочыць праз гэтую пастку толькі ў 1929 годзе, калі Штаты, упаўшы ў дэпрэсію, пагадзіліся прадаць сваё індустрыяльнае ноу-хау. Дый Беларусь з усіх краін Еўропы ратавала і працягвае ратаваць менавіта развітая прамысловасць. У краіне 60 працэнтаў занятых у эканоміцы — гэта ўласна работнікі і бюджэтнікі, так ці інакш звязаныя з індустрыяй. І менавіта гэтую індустрыю нацыяналісты ў выпадку перамогі гатовыя здаць у першую чаргу.

Але тут яшчэ адзін парадокс. Ужо ў 20-я гады мінулага стагоддзя было зразумела, што ***найбольш паспяхова нацыянальныя культуры развіваюцца ў імперыях і заўсёды гаснуць у монанацыянальнай дзяржаве. Прычына ў тым, што імперыі выгадна развіваць нацыянальныя культуры, нацыянальныя адрозненні, бо яны ўсе эканомгеаграфічныя.*** Калі казаць прасцей, лепш прафінансаваць развіццё культуры народаў Крайняй Поўначы, чым спрабаваць завезці туды іншых людзей. Лепш падтрымаць беларусаў на іх балотах, бо ніхто так, як яны, не ўмее гэтыя балоты асвойваць... Для развіцця нацыянальнай культуры важная яе эканамічная далучанасць. Таму калі казаць пра эканамічную інтэграцыю Беларусі ў ЕАЭС — гэта ў тым ліку і гарантыя развіцця нацыянальнай культуры.

***— А чаму тыя, хто называюць сябе нацыяналістамі, гэтага не разумеюць?***

— А гэта зноў парадокс Фуко. Калі вам гавораць пра развіццё нацыянальнай культуры, то менавіта яна будзе паміраць у першую чаргу.

Сёння варта задумацца пра тое, навошта аддаваць нацыянальную культуру ў знешнія рукі? І яшчэ той момант, што не абавязкова выцягваць усё нацыянальнае з архаікі: можна ж і на беларускай мове асэнсоўваць тое, што адбываецца сёння... ***Мы фактычна з 1960-х гадоў маем індустрыяльную культуру. Гэта тое, што дапамагае краіне выжыць, за яго трэба трымацца, яго трэба развіваць. І не дазваляць знешнім сілам інтэрпрэтаваць сябе як адну з усходнееўрапейскіх нацый пачатку XX стагоддзя, якая загнаная ў аграрнае гета...***

***— Чым больш схіляцца да нацыяналізму, тым большая верагоднасць страціць сябе як нацыю... Зноў парадокс?***

— Парадокс, вядомы яшчэ сто гадоў таму. Вудра Вільсан яго выдатна разумеў, калі казаў іншым народам, што імперыі — гэта зло...

## Канцэпцыі свабоды. Тое, што без справядлівасці — тое не наша

— У свеце канцэпцый свабоды многа, але дамінуюць у якасці палітычных дзве. Першая — англасаксонская. Яна грунтуецца на ўласнасці. Калі ёсць уласнасць — ёсць свабода, таму што з'яўляецца магчымасць гэтай уласнасцю распараджацца. Другая канцэпцыя — французская, негатыўная. Яна грунтуецца на пасыле, што свабода — гэта тое, што знікла са з'яўленнем дзяржавы і ўласнасці. Мы не ведаем, што свабода такое, бо гэта — «пайдзі туды, не ведаю куды, прынясі тое, не ведаю што», мы не зразумеем, ці свабоду мы знайшлі, калі нешта знойдзем, але ведаем, хто вінаваты ў тым, што яна была калісьці страчана, — дзяржава. Таму абавязак кожнага грамадзяніна — супрацьстаянне дзяржаве. Менавіта гэты код свабоды ляжыць у аснове ўсіх рэвалюцый, у тым ліку і сучасных «каляровых».

***— А ў славян ёсць сваё разуменне свабоды?***

— Ва ўсходнеславянскіх мовах слова «свабода» паходзіць ад «слабада». Што такое слабада — паселішча з ільготным падаткаабкладаннем на аснове таго, што ты ўмееш рабіць штосьці каштоўнае.

***— Дык навошта нам чужы код, калі ёсць свой?***

— Яго і трэба нам сёння вяртаць. Не толькі ў Беларусі — на ўсёй еўразійскай эканамічнай прасторы. Наш базавы код грунтуецца на суб'ектнасці грамадства і на канцэпцыі справядлівасці. Мы без праблем можам меркаваць пра любыя дзеянні ўлады з пункту гледжання справядлівасці. Гэта наша права, наш культурны код. Але як толькі ў гэтай ацэнцы мы мяняем слова «справядлівасць» на нешта іншае, — яно не наша...

***— Атрымліваецца, калі з вуснаў кіраўніка дзяржавы пастаянна гучыць слова «справядлівасць» — значыць, ён ведае, што народу трэба?***

— Так, ён ведае яго культурны код. Тут вось яшчэ якая рэч. ***Свабодным чалавек можа быць сам па сабе. Справядлівым — толькі ў адносінах да іншых або да нейкай сітуацыі. Справядлівасць — утрымліваючы код. Бо ад свабоднага чалавека да маніпулюемага — адзін крок, мы пра гэта ўжо казалі. А паняцце справядлівасці — прамой накіраванасці, яно — пра баланс сістэмы, кагосьці і кагосьці, таму і больш устойлівае да маніпулятыўнага ўздзеяння. Справядлівым быць нашмат больш складаней...***

## Пра глабальны расклад. Хто будзе чарговым «царом гары»?

— Еўропа ператвараецца ў правінцыю, прычым нашмат хутчэй, чым можна было меркаваць. ***Дамінаванне Захаду над светам доўжылася 300 гадоў, але цяпер высвятляецца, што гэта была хутчэй гістарычная выпадковасць.*** Сёння цэнтры эканомікі зрушваюцца на сваё ранейшае, спрадвечнае месца — у Паўночна-Усходнюю і Паўднёва-Усходнюю Азію. Кітай становіцца цэнтрам сусветнай эканомікі, але гадоў праз дзесяць яго можа дагнаць Індыя. У 2008 годзе ў гэтай краіне заснавалі 40 новых універсітэтаў і зрабілі бясплатную сярэднюю адукацыю. Вынік відаць ужо сёння — павялічыўся попыт на нематэрыяльныя актывы. Ужо перад пандэміяй Індыя стала пераганяць Кітай па тэмпах эканамічнага росту. У прынцыпе, усё ўваходзіць у сваю каляіну: менавіта Індыя і Кітай на працягу двух тысячагоддзяў былі эканамічнымі цэнтрамі свету.

Нездарма ЗША перамяшчаюцца ў тым напрамку, збіраючыся рабіць пунктам апоры, новым цэнтрам заходняга свету Аўстралію. Для чаго — каб кантраляваць гандлёвыя патокі, што ідуць з Кітая і Індыі.

Расія даволі цесна ўзаемадзейнічае з Кітаем. І гэта таксама праблема для ЗША, бо там яны не могуць прайграць у вырашэнні «тайваньскага пытання». ***Чаму такія жарсці вакол Тайваня? Тайвань — гэта 67 працэнтаў сусветнай вытворчасці чыпаў. Калі Кітай заўтра возьме кантроль над востравам, можна будзе выкрэсліваць Штаты са спісу перадавых тэхналагічных дзяржаў мінімум на пяць гадоў, пакуль яны не адбудуюць вытворчасць чыпаў у сябе і калі цягнік прагрэсу ўвесь гэты час у краіне будзе стаяць на месцы.*** Бо без чыпаў не працуюць гаджэты, не ездзяць машыны.

І гэтая каардынацыя Расіі з Кітаем зусім невыпадковая. Бо ЗША на два фронты супрацьстаяць не могуць, і яны гэта таксама разумеюць. І ўжо зразумела, што расійскія патрабаванні вярнуцца да дагавораў 1997 года так ці інакш будуць задаволеныя: цвёрдая пазіцыя на адным баку можа лёгка прывесці да страт на другім, а там — рызыка страты Тайваня.

***На сёння мы маем Еўропу і Штаты, якія будуць максімізаваць канцэпт свабоды — бо іншых сродкаў рухаць эканоміку ўжо не знаходзіцца.*** Як прыклад — тыя ж трансгендары, людзі, якія мяняюць пол. На Захадзе гэта не тое што вітаецца — нават прапагандуецца. А што за гэтым стаіць? Інтарэсы буйных фармакалагічных карпарацый, бо такія людзі кожны дзень усё жыццё становяцца спажыўцамі іх дарагіх гарманальных прэпаратаў... Няма больш на чым зарабляць.

***— Усё ўпіраецца ў грошы...***

— Несумненна. І тут сітуацыя паскараецца тым, што з 1 верасня мінулага года Кітай нацыяналізаваў усе алгарытмы. Не толькі «вялікія даныя», але і алгарытмы цяпер трапілі пад этычны кантроль кампартыі. Такім чынам, можна сказаць, Кітай рэалізоўвае ўжо згаданы прынцып справядлівасці, ставячы на дзяржаўным узроўні заслон постпраўдзе і фэйкавым навінам, робячы іх проста немагчымымі. Гэта дае падставы меркаваць, што ***Кітай узяў курс на вяртанне да сацыялізму, але з улікам савецкіх памылак і з кітайскімі рэсурсамі.***

***— ЗША будуць спрабаваць гэтаму штосьці супрацьпаставіць?***

— Так. Але, хутчэй за ўсё, яны ўжо прайгралі. Да ваеннай канфрантацыі ні з Расіяй, ні з Кітаем Амерыка не гатовая. А вось Кітай гатовы ваяваць за Тайвань. Тут ***узнікаюць цікавыя палітычныя расклады, у якіх стратэгічнае першынство будзе належаць Кітаю. А ЗША дастаецца роля і лёс позняга Савецкага Саюза. Галоўнае пры такім развіцці падзей, каб зніжэнне ўплыву ЗША адбылося гэтак жа плаўна і паступова, як было ў выпадку з СССР...***

***— Наўрад ці ЗША пагодзяцца з роллю аўтсайдара, яны пастаянна будуць спрабаваць вярнуць страчаныя пазіцыі.***

— Не думаю. Штаты сыходзяць у Азію, дакладней, у Аўстралію, прычым надоўга. У таго, хто кантралюе асноўныя гандлёвыя шляхі (а мы ўжо казалі, што сусветны эканамічны цэнтр зрушваецца ў Паўночна- і Паўднёва-Усходнюю Азію), будзе высокая запатрабаванасць і ваенна-палітычнай ролі. Страціўшы статус глабальнага гульца, Штаты ўсё роўна застануцца моцным рэгіянальным гульцом.

Не трэба забываць, што пастаянны склад Савета Бяспекі ААН — гэта збор уладальнікаў ядзерных чамаданаў. Двух вялікіх (Расія і ЗША) і трох меншых (Кітай, Францыя і Англія). У выпадку, калі штосьці здарыцца з адным з вялікіх чамаданаў, нават на яго ўласнай тэрыторыі, свет літаральна ўжо не будзе такім, як раней: Зямля будзе шукаць новую арбіту, і гэта, найперш, у прамым фізічным сэнсе... Таму для ўсіх без выключэння важна, каб вырашэнне, хто будзе чарговым «царом гары», адбывалася мірным шляхам, каб было дастаткова разумных і адказных людзей, якія ўсё гэта разумеюць і палітычныя рашэнні прымаюць, кіруючыся гэтым разуменнем.

## Наша месца ў раскладзе. Асэнсоўваць сябе часткай Еўразіі

— Нам неабходна пачынаць асэнсоўваць сябе часткай Еўразіі. Гэта вельмі важна, бо няхай Еўропа правінцыялізуецца, але ж мы ад гэтага выйграем.

Свой праект мы пакуль не сфармулявалі. У Беларусі ёсць магчымасць у Саюзнай дзяржаве зрабіць крок наперад, сфармуляваўшы яе ідэалогію. У Расіі такой магчымасці пакуль няма, бо існуе 13-ы артыкул Канстытуцыі, які адмаўляе якую б то ні было ідэалогію ў якасці дзяржаўнай. Беларусь жа такіх абмежаванняў не мае. А ідэалогія — гэта ж насамрэч дагавор дзяржавы і грамадства. І сёння можна зрабіць часткай гэтай ідэалогіі прамысловую палітыку — паняцце, якое ў развіцці Саюзнай дзяржавы з'явілася толькі ўвосень мінулага года пасля падпісання 28 праграм. Бо ***без ідэалагізацыі прамысловай палітыкі цяжка будзе захаваць рынкі і тыя пазіцыі на іх, якія краіна мае сёння. І, адпаведна, захаваць суверэнітэт.***

Несумненна, будзе ***адбывацца ўплыў Саюзнай дзяржавы на краіны Усходняй Еўропы. Будзе адбывацца экспансія і эканамічная, і каштоўнасная.*** Беларусь — адзіная на гэтай прасторы краіна, якая захавала сістэму падрыхтоўкі прафесійных кадраў для прамысловасці і індустрыяльны вопыт, прывязаны да вытворчасці. ***Як толькі гаворка ідзе пра тое, што нешта трэба рабіць сваёй працай, — тут Беларусь і Расія ў выйгрышы, і перспектывы тут ёсць.***

***Летам 2020-га мы спыніліся своечасова, мы зразумелі, што гэта не наша. Цяпер надыходзіць час сфармуляваць: а што — наша. Беларусы могуць і павінны гэта зрабіць.*** У гады мінулай вайны толькі беларусы з усіх народаў Еўропы масава ратавалі яўрэяў, у той час як суседзі паводзілі сябе зусім інакш. Нядаўнія падзеі з бежанцамі на граніцы — як працяг гэтай ваеннай гісторыі. Значыць, мы адметныя, нам ёсць чым ганарыцца, што развіваць. Такія рэчы важныя, іх нельга ўпускаць. ***Сёння грамадству неабходна даць адказы на многія пытанні, тую самую ідэалогію, якая дазволіць яму ўсведамляць сябе самадастатковым, паспяховым, перспектыўным.***

***— Мы якраз у працэсе. Можа быць, у нас не так шмат часу, як хацелася б...***

— Так, давядзецца паспяшацца. Бо сітуацыя і ў свеце, і ў нашым рэгіёне будзе развівацца даволі хутка.

***— Як кажуць у Беларусі, «будзе вельмі цікава»?***

— У гэтым можаце не сумнявацца.

**Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# КАВАРНЫ ЛЁД

## Рыбалка без прыгод

Аматары зімовай рыбалкі з нецярпеннем чакаюць узмацнення марозу і, адпаведна, трывалага лёду. Аднак калі больш вопытныя рыбакі не спяшаюцца выходзіць на лёд, іншыя, надзеўшы на сябе рыбалоўны рыштунак і ўзяўшы снасці, шпацыруюць да возера ці рэчкі ўжо пасля першых замаразкаў.

Першай ахвярай лёду гэтай зімой стаў мужчына, які лавіў рыбу на рацэ Обаль, што ў Полацкім раёне. Рыбака спрабавалі выратаваць, але мужчыну знесла плынню. Яго жонцы, якая таксама прыйшла парыбачыць, пашанцавала — побач былі людзі, якія кінуліся на дапамогу. За два дні да трагедыі на той жа Полаччыне на возеры Шчаты патанулі бацька і сын.

Родным рыбакоў з Мінскага і Клецкага раёнаў удалося пазбегнуць гора. 11 снежня ратавальнікам паступіла паведамленне, што на вадасховішчы Вяча пад лёд праваліўся чалавек. Калі супрацоўнікі МНС прыбылі на месца здарэння, мужчына быў па шыю ў вадзе. Каманда спрацавала аператыўна — і праз некалькі хвілін пацярпелы з дыягназам «пераахаладжэнне» быў дастаўлены ва ўстанову аховы здароўя. У той жа дзень ратавальнікі Міншчыны пасляшаліся на дапамогу яшчэ аднаму чалавеку, жыццё якога магло абарвацца ў халоднай вадзе пад тонкім лёдам. Калі супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях прыбылі да ўказанага вадаёма, мясцовыя жыхары выцягнулі рыбака з вады і перамясцілі ў гумавую лодку. Ратавальнікі дапамаглі выбрацца людзям з лодкі, якая пад вагой ужо дваіх чалавек намервалася сысці пад лёд. Так у лічаныя хвіліны мог загінуць і той, хто лавіў рыбу, і той, хто імкнуўся выратаваць рабака, калі ён праваліўся пад лёд.

— Нельга кідацца на дапамогу знянацку, не падрыхтаваўшыся, бо можна трапіць у такую ж пастку самому, — заўважае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ**. — Калі людзі ўдваіх знаходзяцца ў адной палонцы, гэта ўвогуле небяспечна: спрацоўвае эфект панікі. Калі вы сталі відавочцам таго, як тоне



чалавек, самая лепшая дапамога — патэлефанаваць па нумарах «101» або «112». Затым агледзьцеся па баках, знайдзіце доўгую палку або вяроўку, працягніце яе таму, хто тоне. Нават калі нешта пойдзе не па плане, ратавальнікі будуць спяшацца да вас дваіх.

Днямі ратавальнікам патэлефанаваў сам пацярпелы. Мужчына паведаміў, што знаходзіцца на льдзіне, якую знесла на сярэдзіну вадасховішча «Вялута», што ў Лунінецкім раёне. Супрацоўнікі МНС, якія аператыўна прыбылі на месца здарэння, з дапамогай ратавальнай дошкі з сярэдзіны вадасховішча выцягвалі ўжо двух рыбакоў. Трэці рыбак, які таксама клікаў на дапамогу, быў выяўлены на супрацьлеглым беразе. У медыцынскай дапамозе выратаваныя не мелі патрэбы. Затое яны надоўга засвоілі ўрок — выходзіць толькі на памацнелы лёд!

Мала хто ведае, што трываласць лёду лёгка вызначаецца па яго колеры. Самы моцны мае празрысты сіні колер, слабы — непразрысты белы, найбольш далікатны — шэры і шэры «ў крапінку»: пры знаходжанні на такім пакрыцці шанц зладзіць сабе экстрэмальную лоўлю вельмі вялікі. Акрамя таго, важна ведаць, што пры нулявой тэмпературы, якая захоўваецца на працягу трох дзён, трываласць лёду зніжаецца на 25 %. Забараняецца выходзіць на лёд у перыяды яго замярзання і раставання. Небяспечна праверць трываласць лёду ўдарам нагі. Лепш за ўсё рыбачыць там, дзе ёсць станцыі Таварыства ратавання на водах і дзяжураць ратавальнікі.

Для аматараў начнога клёву лепш устрымацца ад гэтай задумкі. У цёмны час сутак чалавеку, які праваліўся пад лёд, будзе больш складана выбрацца. Акрамя таго, шанцы дачакацца дапамогі будуць роўныя нулю: вячэрніх падарожнікаў побач з вадаёмамі няшмат, а калі яны і апынуцца недалёка, дзе гарантыя, што ў цэмры заўважаць таго, хто трапіў у бяду?

## Забава скончылася трагедыяй

У дзяцей да лёду — асаблівая цікавасць. Яны ўспрымаюць яго выключна як забаву і небяспеку проста не разумеюць. Бацькі павінны патлумачыць дзецям, што выходзіць на лёд катэгарычна нельга! Для катання на каньках ёсць спецыяльна абсталяваныя месцы.

Трагедыя адбылася перад самым Новым годам на Полаччыне. Гэтым разам пад лёд праваліліся дзеці 10 і 12 гадоў. Як стала вядома, у той дзень адзін з іх святкаваў дзень нараджэння. Хлопчыкі каталіся на цюбінгах з горкі, што знаходзіцца якраз побач з Заходняй Дзвіной. Адзін з іх вырашыў праверыць таўшчыню лёду і праваліўся ў ваду. Сябар спрабаваў яму дапамагчы і апынуўся там жа. Дзяўчынка, якая была з імі, кінулася шукаць дапамогі. Аднак было позна. Целы дзяцей не знайшлі дагэтуль...

— Да 11 гадоў у дзяцей адсутнічае пачуццё страху, — адзначыў **начальнік вадалазна-ратавальнай службы Віцебскай абласной арганізацыі Таварыства ратавання на водах Вячаслаў ГОРЫН.** — Для іх гэта свайго роду забава. Інстынкту самазахавання практычна няма. Натуральна, трапляючы ў такую сітуацыю, дзеці знаходзяцца ў стрэсе. Іх рэакцыя сапраўды непрадказальная. Нават тыя, хто будзе знаходзіцца побач, наўрад ці змогуць аказаць пэўную паўнавартасную дапамогу. На жаль, дзеці ў такой вадзе і на такой рацэ тонуць вельмі хутка.

## Падрыхтавацца да абраду

Праз тыдзень праваслаўныя хрысціяне адзначаць адно са сваіх галоўных свят — Хрышчэнне Гасподняе. Па традыцыі ў гэты дзень многія вернікі акунаюцца ў палонку, што сімвалізуе ачышчэнне ад грахоў. Аднак, апускаючыся ў ледзяную ваду, людзі не заўсёды да канца ацэньваюць свае сілы і магчымасці. Мала хто ведае, што гэта вялікі стрэс для арганізма. Таму, калі чалавек, які плануе нырнуць на Хрышчэнне ў ваду, нездаровы, лепш гэтага не рабіць. У зоне асаблівай рызыкі — людзі з дыябетам, гіпертаніяй, туберкулёзам. Акрамя таго, не рэкамендуецца ныраць у купель дзецям і цяжарным жанчынам.

Калі вы ўсё ж вырашылі далучыцца да абраду, перад выхадам з дому рэкамендуецца добра паесці. Апрануцца патрэбна не толькі цёпла, але і зручна. Абавязковы атрыбут — шапка, якая не нашкодзіць асаблівa тады, калі вы выйдзеце з вады. Важна паклапаціцца і аб абутку, які не слізгае. Ратавальнікі раяць не акунацца ў ваду з галавой. У той жа час не бойцеся і адразу заходзьце на патрэбную глыбіню. У купелі лепш за ўсё знаходзіцца не больш за адну хвіліну. Як толькі вы выйшлі з вады, саграваецеся: расціраййце сябе ручніком, пераапраніцеся ва ўсё сухое, папіце чаго-небудзь гарачага (ні ў якім разе не алкагольнага, іначай вы падвергнеце свой арганізм двайному стрэсу). Калі самастойна справіцца з пераахаладжэннем не атрымаецца, звярніцеся да медыцынскіх супрацоўнікаў, якія абавязкова будуць дзяжурыць каля купеляў.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

**Калі вы праваліліся пад лёд:**

— не панікуйце;
— клічце на дапамогу;
— імкніцеся не паглыбляцца ў ваду з галавой;
— павярніцеся ў той бок, з якога прыйшлі;
— раскіньце рукі і напаўзайце на лёд грудзьмі;
— закіньце на лёд нагу і адкаціцеся ад палонкі;
— выбраўшыся з вады, не спяшайцеся ўставаць (каб не праваліцца зноў), паўзіце да берага па сваіх слядах.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Здарэнні

## ВЫКІНУЎ З АКНА КВАТЭРЫ ТЭЛЕВІЗАР

**У Партызанскае РУУС сталіцы паступіла паведамленне ад 39-гадовай мінчанкі. Яна паведаміла аб тым, што кватэранаймальнік сапсаваў маёмасць, якая знаходзілася ў адведзеным для здачы жыллі.**

Як інфармуе ГУУС Мінгарвыканкама, устаноўлена, што 19-гадовы студэнт сталічнай ВНУ арандаваў у пацярпелай кватэру на суткі і запрасіў сяброў. Падчас ужывання спіртных напояў малады чалавек выкінуў з акна кватэры, размешчанай на другім паверсе, прадметы побыту, у тым ліку тэлевізар.

Па словах затрыманага, прычынай такога ўчынку паслужыла знаходжанне яго ў стане моцнага алкагольнага ап'янення. Сума нанесенай шкоды склала 1500 рублёў.

Вядома, што раней да крымінальнай адказнасці малады чалавек не прыцягваўся. Распачата крымінальная справа за хуліганства.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ВЫРАТАВАЛІ ДЗЯКУЮЧЫ СЛУПКУ

**У Аршанскім раёне ў лесе заблукаў мужчына: яго знайшлі работнікі МНС**

**У 11.48 у цэнтр аператыўнага ўпраўлення Аршанскага гаррайаддзела па НС ад мужчыны паступіла паведамленне аб тым, што ён заблукаў у лесе паблізу чыгуначнай станцыі «Лужкі».**

На месца былі неадкладна накіраваны падраздзяленні Аршанскага гаррайаддзела па надзвычайных сітуацыях. Што было далей, паведамляе МНС.

Па дарозе ратавальнікі звязаліся з заяўнікам. Ён сказаў, што знаходзіцца ў лесе недзе паміж вёскай Лужкі і гарпасёлкам Багушэўск. У мужчыны ўдакладнілі, ці ёсць там нейкія характэрныя будынкі ці збудаванні, на што можна сарыентавацца. Той адказаў, што стаіць побач са слупком з нейкімі лічбавымі знакамі. Запісаўшы маркіроўку слупка, ратавальнік стэлефанаваўся з прадстаўнікамі лясной гаспадаркі, якія паказалі каардынаты, дзе згаданы слупок устаноўлены. Ужо разам з імі і прадстаўнікамі міліцыі паехалі на месца і знайшлі мужчыну. Па лесе ён прайшоў каля васьмі кіламетраў, візуальна быў стомлены і моцна змёрзлы. Дабрацца дадому яму дапамаглі супрацоўнікі міліцыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Валютныя рэзервы Кітая дасягнулі шасцігадовага максімуму



Валютныя рэзервы КНР, найбуйнейшыя ў свеце, у снежні выраслі на $28 млрд — да $3,250 трлн у параўнанні з $3,222 трлн на канец лістапада. Пра гэта сведчаць даныя Дзяржаўнага ўпраўлення валютнага кантролю (SAFE) Кітая.

Аб'ём рэзерваў дасягнуў максімуму за шэсць гадоў, падкрэсліла кітайская газета Global Times. Павелічэнне рэзерваў было адзначана па выніках трэцяга месяца запар. Эксперты, апытаныя The Wall Street Journal, у сярэднім чакалі іх зніжэння на $2 млрд. Рост рэзерваў у снежні абумоўлены прытокам капіталу ў краіну, які кампенсаваў эфект аслаблення долара ЗША, адзначылі ў SAFE. «Доларавы індэкс знізіўся, у той час як цэны фінансавых актываў многіх краін змяніліся рознанакіравана», — заявіў прадстаўнік SAFE Ван Чунын. Запасы золата ў вартасным выражэнні ў КНР у снежні павялічыліся да $113,13 млрд.

## Аліхан Смаілаў прызначаны новым прэм'ер-міністрам Казахстана

Прэзідэнт Казахстана Касым-Жамарт Такаеў прызначыў Аліхана Смаілава прэм'ер-міністрам, паведаміла «Казінфарм». Падчас пасяджэння Мажыліса (ніжняй палаты парламента) за кандыдатуру Смаілава прагаласавалі 89 чалавек. Як адзначыла ТАСС, Такаеў даручыў новаму прэм'еру на працягу трох тыдняў прадставіць праграму дзеяннеяў урада. Прэзідэнт паведаміў, што сістэма дзяржаўнага кіравання ў Казахстане патрабуе рэфармавання. Паводле яго слоў, колькасць дзяржапарату цяпер аптымальная, далей магчымыя скарачэнні. Аліхан Смаілаў займаў пасаду першага намесніка прэм'ер-міністра Казахстана з мая 2020 года. Да гэтага ён быў першым намеснікам прэм'ер-міністра — міністрам фінансаў, у розныя гады займаў пасады міністра фінансаў, памочніка прэзідэнта Казахстана.

## Сусветны рэкорд па заражэнні каранавірусам зафіксавалі ў ЗША

Больш за 1,13 мільёна выпадкаў заражэння новым каранавірусам выяўлена ў ЗША. Гэта рэкордны сутачны прырост з пачатку пандэміі сярод усіх краін, паведаміла Reuters. Папярэдні рэкорд быў зафіксаваны 4 студзеня, калі амерыканскія медыкі за суткі выявілі звыш мільёна выпадкаў выклiканага каранавірусам захворвання ва ўмовах распаўсюджвання амікрон-штама. Да гэтага рэкордны паказчык быў зафіксаваны ў апошні дзень снежня 2021-га — каля 590 тысяч выпадкаў заражэння каранавірусам. Акрамя таго, паводле статыстыкі агенцтва, колькасць шпіталізаваных з ковідам перавысіла 132 тысячы чалавек, пабіўшы рэкорд студзеня мінулага года. Даныя могуць не адлюстроўваць рэальную сітуацыю, бо многія амерыканцы здаюць тэсты на каранавірус дома і не паведамляюць вынікі. Паводле інфармацыі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, больш за ўсё пацверджаных выпадкаў заражэння каранавірусам зарэгістравана ў ЗША. Далей ідуць Індыя, Бразілія і Францыя. Смяротных зыходаў больш за ўсё ў ЗША, другі радок займае Бразілія, трэці — Індыя. Таксама стала вядома, што ў ЗША смяротнасць праз COVID-19 вырасла за тыдзень на 29 працэнтаў.

Праблема стагоддзя

# ПРАВА НА ВЫРАТАВАННЕ МАЕ КОЖНЫ

## Як у Беларусі рэалізоўваецца эксперыментальная праграма рэабілітацыі нарказалежных

**ПАД медыцынскім наглядам у сувязі з ужываннем наркотыкаў у Беларусі знаходзіцца каля 13,5 тысячы чалавек. З іх каля 7,3 тысячы маюць сіндром залежнасці. Штогод больш за тысячу чалавек урачы бяруць пад медыцынскае назіранне. Пры гэтым каля 600 чалавек штогод з такога ўліку знімаюць. Праўда, каля дзвюх соцень з іх — не з прычыны адмовы ад ужывання, а з-за смерці.**



Нарказалежным хворым неабходная дапамога, не толькі таму, што пастаянны прыём наркотыкаў падрывае іх фізічнае і псіхічнае здароўе. Церпяць адносіны з роднымі і блізкімі, пачынаюцца праблемы на рабоце, часта даходзіць і да правапарушэнняў. Аднак для поўнага пазбаўлення ад залежнасці спатрэбіцца прыкласці значныя намаганні і патраціць шмат часу. Як праходзіць медыцынская рэабілітацыя нарказалежных у нашай краіне, расказалі спецыялісты.

### УЗРОСТ НАРКАСПАЖЫЎЦОЎ — 18-30 ГАДОЎ

Летась назіралася невялікае зніжэнне колькасці тых, хто ўпершыню трапіў у поле зроку медыкаў з сіндромам залежнасці — іх было 386 чалавек. Усяго ж медыцынскае назіранне ў сувязі з ужываннем наркотыкаў было ўстаноўлена для 1300 чалавек (1100 — год таму). Рост колькасці ўзятых пад назіранне фіксуецца ва ўсіх рэгіёнах, за выключэннем Брэсцкай і Віцебскай абласцей.

— Сёння мы бачым наступныя пагрозы: з'яўленне новых відаў наркатычных сродкаў, пашырэнне практыкі іх незаконнага выкарыстання, распаўсюджванне праз інтэрнэт, у тым ліку падлеткамі, якія часта не ўсведамляюць цяжар крымінальнага праследу і пакарання, — кажа **Арцём МАЛМЫГІН, начальнік Рэспубліканскага цэнтра наркалагічнага маніторынгу і прэвенталогіі РНПЦ псіхічнага здароўя.**

Сярэдні ўзрост наркаспажыўцоў — 18-30 гадоў. І зусім невялікая колькасць тых, каму за 30-40. Гэта не дзіўна, бо чым старэйшы ўзрост, тым больш саматычных хвароб нават у здаровага чалавека, што ўжо казаць пра наркаспажыўца, у якога істотна аслаблены імунітэт. Гэта адна з самых уразлівых катэгорый для з'яўлення любых хвароб. Адметна, што падлеткі і моладзь спрабуюць наркотыкі ў сярэднім з 14 да 20 гадоў, але рэдка звяртаюцца па медыцынскую дапамогу з гэтай нагоды. У стацыянар трапляюць ужо ў 25-40 гадоў.

— Нарказалежнасць — не ізаляванае захворванне, гэтыя людзі залежныя і ад алкаголю, і ад медыкаментозных прэпаратаў. І без лячэння яны, як правіла, не дажываюць да пажылога ўзросту, — адзначае **Сяргей МАРЧУК, загадчык 18-га наркатычнага аддзялення РНПЦ псіхічнага здароўя.**

### МЕТАДОНАВАЯ ТЭРАПІЯ ПРЫНОСІЦЬ СВОЙ ЭФЕКТ

Сёння ў Беларусі існуюць розныя віды дапамогі як наркаспажыўцам, у якіх яшчэ не сфарміраваная залежнасць, так і нарказалежным. Гэта ананімныя і неананімныя кансультацыі псіхатэрапеўтаў, урачоў-псіхіятраў-нарколагаў на базе псіхіятрычных наркалагічных дыспансераў, псіхіятрычных бальніц у рэгіёнах. А таксама дынамічнае дыспансернае назіранне ва ўрачоў-псіхіятраў-нарколагаў з магчымасцю атрымліваць медыкаментознае суправаджэнне і лячэнне. Працуюць і доўгатэрміновыя праграмы рэабілітацыі, і праграмы замяшчальнай тэрапіі, у тым ліку і метадонавай.

Што датычыцца апошняй, то яна, паводле назіранняў медыкаў, аказвае свой станоўчы эфект, бо мае істотны ўплыў на сацыялізацыю нарказалежных. Больш за 52 % пацыентаў на замяшчальнай метадонавай тэрапіі працаўладкавана, каля трэці мае сваю сям'ю. Яны знаходзяцца пад пастаянным назіраннем медыкаў, праходзяць медабследаванні, у іх зніжаецца рызыка перадазіроўкі. Таму адмяняць гэтую праграму пакуль няма патрэбы. Трэба адзначыць, што яна фінансуецца са срокаў Глабальнага фонду ААН па барацьбе са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй.

### НЕ ТОЛЬКІ ДЭТОКС, АЛЕ І САЦЫЯЛІЗАЦЫЯ

— Рэабілітацыя людзей, якія маюць стаж наркаспажывання ў некалькі гадоў ці дзесяцігоддзяў і сфарміраваную залежнасць, зводзіцца да таго, каб яны максімальна трымалі сябе ў руках, не зрываліся да ўжывання і выходзілі з патоку наркаспажыўцоў, — кажа Сяргей Марчук. — На жаль, амаль усе рэабілітацыйныя цэнтры працуюць на камерцыйнай аснове і часта цяжкадаступныя ці фінансава затратныя для наркаспажыўцоў і іх блізкіх.

Эксперыментальная рэабілітацыйная праграма для нарказалежных рэалізоўваецца з верасня 2019 года. На базе РНПЦ псіхічнага здароўя працуе эксперыментальны рэабілітацыйны цэнтр. Праграма цалкам бясплатная, даступная для кожнага і мае шэраг пераваг, найперш комплексны медыцынскі падыход.

— Калі раней медыцынская дапамога аказвалася ў выглядзе дэтаксікацыі, медыкаментознай кампенсацыі фізічнага стану і не датычылася далейшай рэабілітацыі ці была абмежаваная кансультаваннем, то цяпер гэта комплексная медыцынская дапамога: дэтаксікацыя, комплекс медыцынскіх мер, каб фізічна палепшыць стан здароўя. Сюды ж адносіцца прызначэнне падтрымліваючай тэрапіі з абследаваннем такіх пацыентаў. Таксама гэта рэабілітацыйная і прафілактычная дапамога, работа з псіхатэрапеўтамі і прадстаўнікамі арганізацый «Ананімныя наркаманы» і «Ананімныя алкаголікі», — расказвае Сяргей Марчук.

> **«На базе РНПЦ псіхічнага здароўя працуе эксперыментальны рэабілітацыйны цэнтр. Праграма цалкам бясплатная, даступная для кожнага і мае шэраг пераваг, найперш комплексны медыцынскі падыход».**

Асаблівасцю праграмы з'яўляецца абавязковы ўдзел у ёй прадстаўнікоў органаў працы і сацыяльнай абароны, медыцынскіх псіхолагаў і іншых спецыялістаў (бо большасць наркаспажыўцоў не мае работы, сям'і, сутыкаецца з цяжкасцямі ў аднаўленні дакументаў і працаўладкаванні). Як адзначаюць медыкі, гэта спрыяе стварэнню новага асяроддзя, каб пазбегнуць рызыкі вяртання да наркаспажывання.

Важную ролю ў вызваленні ад залежнасці адыгрывае і працяглась рэабілітацыі. Звычайна цэнтры аказваюць рэабілітацыйную дапамогу, якая абмежавана па часе — месяц ці два. А пасля ўзнікае пытанне: што далей?

> **«Чым старэйшы ўзрост, тым больш саматычных хвароб нават у здаровага чалавека, што ўжо казаць пра наркаспажыўца, у якога істотна аслаблены імунітэт».**

— Пацыент, які толькі пачаў бачыць жыццё цвярозымі вачыма, зноў вяртаецца ў тое асяроддзе, дзе ёсць вялікая рызыка зрыву і вяртання да наркаспажывання, — кажа Сяргей Марчук. — Наша рэабілітацыя разлічана на 1,5 года. На дэтаксікацыі ў стацыянары пацыенты знаходзяцца 28 дзён. І яшчэ паўтара года яны могуць звяртацца да нас амбулаторна па псіхатэрапеўтычную дапамогу. Як правіла, два разы на тыдзень яны прыязджаюць на групавую ці індывідуальную псіхатэрапію, ёсць магчымасць звярнуцца да прафесійнага спецыяліста па медыкаментозную, псіхатэрапеўтычную дапамогу ці проста папрасіць парады.

Каб трапіць у рэабілітацыйную праграму, дастаткова звярнуцца да ўрача-псіхіятра-нарколага.

— Пра нашу праграму людзі даведваюцца часам выпадкова. Звяртаюцца да нас, каб толькі падкарэкціраваць свой фізічны стан, і наведваюць паўтара года — без парушэння рэжыму, у выніку кардынальна мяняюць свой спосаб жыцця, аднаўляюць работу, месца жыхарства, сямейныя ўзаемаадносіны, — дзеліцца Сяргей Марчук.

Цалкам рэабілітацыйную праграму прайшлі ўжо 40 чалавек — гэта тыя людзі, якія былі максімальна дысцыплінаваныя і матываваныя. Пяць пацыентаў пакуль яшчэ працягваюць амбулаторнае наведванне, адзін рэабілітант заканчвае праграму, 11 чалавек пакінулі праграму пасля дасягнення чаканага выніку. Многія з іх працаўладкаваліся, цалкам адмовіліся ад наркаспажывання, зняліся з уліку, стварылі сем'і і не вяртаюцца да наркаспажывання. Ёсць і тыя пацыенты, якія не гатовыя трымацца працягла, аднак звяртаюцца ў цэнтр у другі, трэці раз і атрымліваюць прафесійную дапамогу.

— Любая залежнасць — гэта не шкодная звычка, не рыса характару, а працяглае хранічнае захворванне, якое мае схільнасць да пастаяннага абвастрэння і нават лятальнага зыходу. Пры правільным лячэнні і прафілактыцы чалавек можа пражыць з залежнасцю ўсё жыццё і мець нядрэнны стан здароўя. З іншага боку, чалавек, які схільны да рэцыдываў і паўторна вяртаецца да прыёму наркотыкаў, у групе рызыкі. Каля 600 чалавек у 2019-га знята з дыспансернага ўліку — здавалася б, аптымістычная лічба, але 200 з іх, на жаль, у сувязі са смерцю.

### ЗБЫТ У ІНТЭРНЭЦЕ І ЎЦЯГВАННЕ ПАДЛЕТКАЎ

Як паведаміў **Аляксандр ХІЛО, начальнік аддзела Галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў,** у Беларусі назіраецца істотнае павелічэнне зарэгістраваных нарказлачынстваў, у тым ліку здзейсненых у складзе групы. Летась іх выяўлена на тысячу больш, чым у 2020-м. Большасць нарказлачынстваў звязана са збытам наркотыкаў. Аб наркапагрозе сведчаць аб'ёмы наркотыкаў, якія канфіскуюць праваахоўнікі — амаль 700 кілаграмаў у 2020 годзе. Пераважную большасць складаюць гашыш, марыхуана і метадон. Перакрыта 26 каналаў паступлення наркотыкаў, ліквідавана пяць наркалабараторый і 62 спецыяльна абсталяваныя памяшканні для вырошчвання наркаэмяшчальных раслін.

Асаблівасцю цяперашняга наркарынку з'яўляецца збыт наркотыкаў у інтэрнэце — выяўлена больш за тысячу такіх злачынстваў. У 2021-м упершыню за сем гадоў назіраўся рост колькасці непаўналетніх, уцягнутых у незаконны абарот наркотыкаў, 103 з іх абвінавачаны ў здзяйсненні нарказлачынстваў, пераважна ў распаўсюджванні. Нагадаем, што крымінальная адказнасць за збыт наркотыкаў наступае з 14 гадоў і караецца працяглым пазбаўленнем волі — ад трох да 25 гадоў.

Больш частымі сталі і смяротныя атручэнні наркатычнымі рэчывамі, каля 70 % з іх адбываецца пры ўжыванні метадону ў спалучэнні з іншымі псіхаактыўнымі рэчывамі.

### НА ПЕРАКРЫЖАВАННІ ЗЛАЧЫННЫХ ШЛЯХОЎ

Мытныя органы спынілі больш за 470 выпадкаў перамяшчэння наркатычных і псіхатропных рэчываў. Распачата 141 крымінальная справа. Летась канфіскавана каля 400 кг наркатычных сродкаў.

> **«Амаль усе рэабілітацыйныя цэнтры працуюць на камерцыйнай аснове і часта цяжкадаступныя ці фінансава затратныя для наркаспажыўцоў і іх блізкіх».**

— Мытныя органы сутыкаюцца з праблемамі незаконнай вытворчасці наркатычных сродкаў у краінах Паўночнай Афрыкі, найперш гашышу, вытворчасці какаіну ў Лацінскай Амерыцы, сінтэтычных псіхатропных сродкаў у Заходняй Еўропе і спробамі іх перамяшчэння транзітам праз нашу краіну ў Расію, з нелегальнай вытворчасцю опію і гераіну ў Афганістане і спробай дастаўкі іх у Заходнюю Еўропу, вытворчасцю новых псіхатропаў у Кітаі і пастаўкай іх паштовымі адпраўленнямі ў тым ліку і ў Беларусь, — адзначае **Дзмітрый ЖАРНАСЕК, намеснік начальніка аддзела барацьбы з кантрабандай галоўнага ўпраўлення арганізацыі барацьбы з кантрабандай і постмытнага кантролю Дзяржаўнага мытнага камітэта.** — З краін Еўразійскага саюза паступаюць гашыш, марыхуана, а таксама сінтэтычныя наркотыкі, з тэрыторыі Украіны перамяшчаюцца наркотыкі пераважна расліннага паходжання.

...Часта не толькі наркаманы адмаўляюць сваю залежнасць, але і іх сваякі. У выніку медыкам даводзіцца прымаць меры ўжо ў запушчаных выпадках, калі хворы становіцца сацыяльна небяспечным ці знаходзіцца на мяжы гібелі. Наркаманія — тая праблема, якая не вырашаецца сама па сабе: чым хутчэй вы распачняце дзеянні, тым лягчэй з ёй будзе справіцца.

# БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР НА 2022 ГОД

**У народным календары захаваны прыродна-храналагічныя веды народа. У аснове — хранонімы (памятныя дні), якія зафіксаваны ў вуснай народнай творчасці беларусаў.**
**Сістэматызаваны беларускі народны каляндар у складзе з велікодна-валачобнымі песнямі, якія ў строгай храналагічнай паслядоўнасці апісваюць традыцыйныя прысвяткі і святы, у тым ліку тыя, што закансерваваліся ў непараўнальных паэтычных узорах як наваголдзі/навалецці, з'яўляецца нашым шэдэўрам і фенаменальнай з'явай сусветнай нематэрыяльнай культуры. Акрамя таго, валачобныя песні, што выконваліся на Вялікдзень, тагачасны Новы год/лета, уяўляюць сабой паэтычны каляндар, падобнага якому няма сярод традыцый народаў зямлі.**
**У народным календары на 2022 год прадстаўлены асноўныя святы і прысвяткі з кароткімі тлумачэннямі, прыкметамі, прымаўкамі, урыўкамі з валачобных песень і г. д. Дні, якія адзначаюць беларусы-католікі, выдзелены курсівам. Зорачкай /*/ пазначаны святы рухомай царкоўнай пасхаліі, што не маюць сталага месца.**
**У наступным, 2023, годзе па каталіцкай пасхаліі Вялікдзень (Пасха) 9 красавіка, а па праваслаўнай — 16 красавіка.**
**Умоўныя абазначэнні: п — панядзелак, а — аўторак, с — серада, ч — чацвер, пт — пятніца, сб — субота, н — нядзеля.**
**Асобныя астранамічныя звесткі, што падаюцца, адносяцца да Мінска.**
**Больш падрабязна пра значэнне хранонімаў календара можна прачытаць у А. Лозкі «Беларускі народны каляндар» (Мінск, 1993, 2002) і інш.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## СТУДЗЕНЬ

**1. сб. Новы год.** ВКЛ перайшло на студзеньскі стыль у 1550 г., Расія — у 1700 г.
**6. ч. Першая, Посная куцця.** Перадкалядная вячэра. Які дзень, такі і год. ***Богаз'яўленне, Тры Каралі.*** Католікі праводзілі маскіраваны абрад «Тры каралі», або «Гэроды».
**7. пт. Раство Хрыстова.** Пачатак **Каляд.** «Ой, Калядачкі, бліны-ладачкі...». Калядавалі. Насілі «звязду». Паказвалі батлейку, праводзілі ігрышчы («вадзілі казу», «жанілі Цярэшку», «пяклі ката», гулялі ў «Яшчура» і інш.).
**9. н. Сцяпан.** Даўней дзень найму слуг, батракоў на год. «На святога Сцяпана вышэй слуга за пана».
**13. ч. Шчодрая куцця.** Пачатак **Шчодрага тыдня.** «Мароз, хадзі куццю есці».
**14. пт. Васілле. Новы год** па праваслаўным календары. «Сею, сею пасяваю, з Новым годам вас вітаю».
**18. а. Трэцяя, Галодная, Вадапосная куцця.** Апошнія дні Каляд. «Каляда ад'язджае».
**19. с. Вадохрышча (Кшчэнне).** «Святое Кшчэнне ваду ксціла..., свет ачысціла і ваду наверх пусціла», «На Вадохрышча завіруха — на Вялікдзень таксама».
**20. ч. Прывадохрышча** — заканчэнне Каляд. Пачатак **Малой вясельніцы** (да посту).
**24. п. *Аксіння*.** «Аксіння дарогу перамяце, а корм падмяце». **Фядос.** «На Фядоса цёпла».
**25. а. Таццяна.** Свята студэнтаў. ***Павел***. «Вее вецер — будзе вайна».
**31. п. Апанас,** Гусінае свята. Свята свойскай жывёлы. «Хавай нос у апанасаўскі мароз».

## ЛЮТЫ

**1. а. *Ігнат.*** «На Святога Ігната зіма багата».
**2. с. *Грамніцы, Стрэчанне.*** «Калі на Грамніцы нап'ецца певень вадзіцы, то на Юр'я наесца вол травіцы», «Грамніца — хлебу палавіца».
**5. сб. *Агата.*** Каровіна свята. «Хлеб і соль святой Агаты не пусціць бяды да хаты».
**6. н. *Дарота.*** «Па Дароце высахнуць хусты на плоце». **Паўзіміца Аксіння.** «На Аксінні мяце», «Які дзень на Аксінню, такая будзе і вясна»
**11. пт. Ігнат.** «Ігнат Грамніцам рад».
**12. сб. Стрэчаньскія Дзяды.**
**14. п. *Валянцін.*** Свята закаханых. **Трыфан.** «На Трыфана зорна — вясна позняя».
**15. а. Грамніцы, Стрэчанне.** «Зіма з летам сустракалася, пра здароўейка пыталася». «На Грамніцы палавіна зіміцы».
**18. пт. Агата.**
21. п. Пачатак ***Памінальнага, Дзедавага тыдня.***
**24. ч. *Мацей*.** «На Мацея дарога пацее», «На Мацея адліга — будзе мароз». **Улассе, Аўлас.** Свята жывёлы. «Аўлас на сыры лас», «Ты, Улас, Улас. Ты наймíся ў нас скату пасвіць».
**25. пт. *Дзедава пятніца.**
**26. сб. *Памінальніца.** Канец Памінальнага тыдня. Калі «вея» ў нядзелю, то авёс трэба сеяць на 9-м тыдні, калі ў панядзелак — то на 8-м, калі ў сераду ці чацвер — то пакідалі «дзесяцінкі дзве». **Фаціння.** Заступніца ад хвароб (ліхаманак, трасцы і інш.).
**28. п. *Рабы тыдзень, Вясельніца, Развітальны, Сырапусны, Масленічны тыдзень.** Тыдзень перад Масленіцай. Які добры дзень на Масленым тыдні, у той дзень ад Ільі сеялі лён. Дзяўчаты вешалі «калодкі» нежанатым хлопцам. ***Дзень сустрэчы** на Масленым тыдні.

## САКАВІК

**1. а. *Залвіцыны вячоркі.**
***2. с. *Серада Папяльцовая*** (пач. Вялікага посту ў католікаў, да 16.04). ***Лысая серада.** На ўзгорках з'яўляюцца «праталіны-залысіны». (*Маладзік да 9.03*).
**3. ч. *Блакітны чацвер. Тумановы дзень. *Крывы, Тлусты чацвер, Валосы, Валосся.** Свята жывёлы. «На Валосага бліны пяклі ці аладкі, каб былі валы гладкі».
**4. пт. *Цешчыны вечары. *Казімір*.** «Святы Казімір дровы сякець і ў клад кладзець».
**5. сб. *Масленыя Дзяды (Бабы).** «Дзяды не знаді бяды, а нашы ўнукі зазналі мукі». **Васіль Капальнік.** Са стрэх капае.
**6. н. *Масленіца.** «Масленіца ў «вятху» (пасля поўні) — дзяржы пшаніцу ў мяху, сей пшаніцу на ўсю руку». ***Развітальны, або Дараваны дзень. *Гуканне вясны.** «Благаславі, Божа, зіму замыкаці, вясну загукаці». На Палессі вадзілі карагоды, «спявалі чырачку», насілі ёлку з вянком.
**7. п. *Паласказуб.** Першы дзень **Вялікага посту** (да 23.04). Паласкалі зубы гарэлкаю (у час посту не пілі).
**9. с. *Уступная серада.** Каб урадзіў лён, мылі верацёны ці калаўроты, хадзілі ў карчму і перасковалі праз пень. ***Заляцанне** на Масленым тыдні. **Янка, Паўрацэнне.** Мядзведзь паварочваецца ў берлагу на другі бок.
**12. с. *Зборава субота.** Абрад «Споведзі дзежкі». ***Рыгор***. «На святога Рыгора ідуць рэкі ў мора».
**13. н. *Зборніца, Ізбор.** Адзін з варыянтаў Новага года/лета пасля прыняцця юліянскага летазлічэння. «Святы Ізбор упярод ступіць». Пачатак збору селяніна ў поле.
**14. п. Аўдоцця Вясноўка, Аўдокі. Гуканне вясны.** «На Аўдокі голы бокі». (1.03 Новы год / Новае лета ў мінулым, сакавіцкі каляндарны стыль). «Святы Еўдакей ... пераступ года», «Калі на Аўдакеі добрае надвор'е, то будзе добры лён».
**15. а. Хвядот.** «На Хвядота занос — усё сена знясе».
**17. ч. Герасім Гракоўнік.** «Герасім гракоў прыгнаў».
***18. пт.** Веснавое раўнадзенства. Усход 7.17, захад 19.18. Поўня* (*да 24.03*).
**19. сб. *Язэп.*** «Святы Язэп сярод посту шлюб дае прахвосту» (забарона на шлюб). «На Язэпа пагода — год ураджайны».
**22. а. Саракі.** Было Новым годам/летам. Свята вясновага раўнадзенства. «Дзень з ноччу мераецца». «Святыя Саракі наперад пайшлі». Свята птушак. Прылятае 40 выраяў. «Святыя Саракі ў поле саху валаклі». **Пліска**. «На святога Пліска праб'ець лёд і пліска».
**25. пт. *Дабравешчанне, Звеставанне.*** «І птушка гнязда не кладзе». Прылёт бусла. **Гуканне вясны.** Было Новым годам/летам. «Перша свята — нова летца, Благавешчан зямлю сушыць». **Рыгор.** «На Рыгора зіма ідзе ў мора».
**26. сб. Міжблагавешчыны** (да 7 красавіка). Забарона на «запасванне» кароў.
**28. п.** *Пачатак **Храстовага тыдня.** Пяклі «храсты». Засеўкі. Абрад «жаніцьбы коміна».
**30. с. *Серадапосце.** Выпякалі «храсты». **Аляксей Цёплы.** Дзень рыбалова. «На Цёплага Аляксея рыба ідзе на нераст, карова на верас, а бортнік на хвою».

## КРАСАВІК

**1. пт. Дар'я Вясенняя.** Адбельвалі палотны.
**5. *а. Арына*.** «На Арыну сей капусту ў расадніках».
**6. с. Камаедзіца.** Свята мядзведзя. **Благавеснік.** Пяклі пірагі «буслявы лапы».
**7. ч. Благавешчанне.** «Благавешчанне без ластавак — халоднае лета». Абрад «Страла».
**8. пт. Благуста.** «На Благусту сей капусту».
**9. сб. Матрона.** «На Матрону шчупак хвастом лёд разбівае».
**10. н.** * ***Пальмова нядзеля.*** «Вярба б'е, не я б'ю».
**11. п.** Пачатак ***Пахвальнага тыдня.** «Дзікая качка яйцом пахваліцца».
**14. ч.** Прабуджэнне хатніка. У гэты дзень хлусілі, каб заблытаць хатніка. «Апрэль — нікому не вер». **Мар'я.** Калі ў ясную ноч прыбывала вада, то суха будзе ў жніво на хлебнай ніве.
**15. пт. *Пахвальная пятніца.** Мыццё дзежак. **Палікарп.** «Пачатак бясхлебіцы».
**16. сб. *Пахвальная субота.** Не грымелі кроснамі, каб гром не грымеў. **Мікіта.** «Калі на Мікіту крыгаход, то няма ні клёву, ні лову рыбаловам».
**17. н.*ВЯЛІКДЗЕНЬ*** у католікаў. ***Вербніца.** Асвячалі вярбу, сцябалі ёю, прыгаворваючы «Не я б'ю, вярба б'е, за тыдзень — Вялікдзень».
**18. п.** Пачатак ***Белага, Вялікага, тыдня. *Чысты панядзелак.** Бялілі і мылі ў хаце.
**19. а. *Чысты аўторак.** Каб на людзей і «гаўядо» не напала «парша», трэба ўсё мыць.
**20. с. *Дравяная страсць.** Мыюць усё драўлянае.
**21. ч. *Чысты чацвер.** Ідуць у лазню. Абрад мыцця дзежкі. **Руф.** Руф рушыць снягі.
**22. пт. *Чырвоная, Велікодная пятніца.** Сеялі гарох.
**23. сб. *Вялікая, Чырвоная субота.** Фарбавалі яйкі. Канец Вялікага посту. ***Юры.*** (Новы год па задыяку). «Першае святца — святы Юр'я», «Як зязюля закукуе за 12 дзён да Юр'я на «голы» лес, то не чакай ураджаю і будзе хварэць жывёла». ***Войцах.*** «Святы Вайцеху выпусціў жаўранка з меху».
**24. н. *ВЯЛІКДЗЕНЬ.** «Хрыстос уваскрос! — Сапраўды ўваскрос!». Быў Новым годам. «Першае свята — свята Вялікадня». **Анціп** — ахоўнік зубоў.
**25. п.** Працяг *Вялікадня. «Першы дзень пірагі маюць, а сярэдні (п.) пагуляюць, а апошні (а.) дзень выпраўляюць». У Жыткавіцкім раёне на другі дзень праводзілі свята сена. ***Марк.*** «Дождж на Марка, дык зямля як шкварка».
**27. с. *Градавая серада. Праводны, Мёртвы тыдзень.** «Пайшла зіма да Кіева, а лета нам пакінула».
**28. ч. *Людавы дзень.** Раней у Віленскай губерні білі і качалі яйца з лубкоў, гушкаліся на арэлях. ***Вялікадне мёртвых (Наўскі Вялікдзень, Мёртвы Вялікдзень, Наўскі чацвер).** Дзень памінання на могілках. Хлопцы і дзяўчаты абліваліся вадою. **Пуд.** «Пуд снег пугне».
**29. пт. *Прашчэнне.** Абліваліся вадою. **Арына.** «На Арыну сей капусту на расаду».
**30. сб. Зосім** — ахоўнік пчол. **Андрыянава ноч, Андрэй.** Ноч дзявочай варажбы і чараўніцтва.

## МАЙ

**1. н. Кузьма.** «Май Кузьма з морквінай сустракае, а Пахом з гурком».
**2. п. *Праводная нядзеля.** «Ідзі, зіма, да Кучава, як ты нам надакучыла». ***Радаўнічныя Дзяды.**
**3. а. *Радаўніца.** «На Радаўніцу да абеду пашуць, па абеду плачуць, а к вечару скачуць».
**5. ч.** Ляльнік. Свята Лялі — дачкі Лады. «Благаславі, маці, / Ой, Лада, маці! / Вясну заклікаці».
**6. пт. Юр'е.** Свята жывёлы. «Як дождж на Юр'я — хлеб будзе і ў дурня». Абрад «Страла».
**7. сб. Алісей.** «Прыйшоў Алісей — авёс пасей». Бабскія розбрыкі. Скокі жанчын і качанне па зямлі дзеля ўрадлівасці.
**8. н. *Станіслаў.*** «Сей лён на Станіслава — вырасце як лава». **Марк.** «Дождж на святога Марка — дык зямля, як шкварка». ***Міраносцы.** «На Міраносця п'яныя бабы цігаюць адна адну за валосся». Ярылавіца. Свята Ярылы, вясновага божышча.
**13. пт. Якуб.** «На Якуба грэе люба».
**14. сб. Макарэй.** Абрады каля вады.
**15. н. Барыс.** Апякун поля і жывёлы.
**16. п.** Пачатак ***Пераплаўнага, Чарвівага тыдня.** Не трэба садзіць, бо заядуць чэрві.
**18. с. *Градавая, Пераплаўная серада.** Засцярогі ад граду і дажджу. **Арына Расадніца.** Дзень высаджвання расады ў Паазер'і.
**20. пт. Антоній.** «На святы Антоній сей авёс для коней, а як удасца, дык і прадасца».
**21. сб. Іван Веснавы.** Апякун земляроба. «На Івана каласок, а на Пятра піражок».
**22. н. Мікола Веснавы.** Свята пастухоў. ***Алёна.*** «Сей лён на Алену, будзе кашуля па калена». ***Сёмуха, Зялёныя святкі, Святы Дух.*** Свята зелені. «На Духа будзе цёпла і суха».
**23. п. Зілот.** «Сей пшаніцу на Зілота, і яна будзе як злота».
**24. а. Макей.** «Мокра на Макея — і лета не прасушыць». **Кірыла і Мяфод.** Калі дзень мокры — і лета будзе мокра.
**25. с. Епіфан.** «На Епіфана раніца ў чырвоным каптане, неба з барваю — гарачае лета».
**26. ч. *Ушэсце. Унебаўшэсце пана Езуса.*** Свята агляду жыта.
**27. пт. *Градабойцы, Ледавіты дзень** (Віленская губ.). **Сідары.** «Прыйшлі Сідары — прыйшлі і сіверы».
**28. сб. Пахом.** «Святы Пахом павее цяплом». «Сей агуркі на Пахом — будзеш насіць мяхом».
**29. н. *Магдалена.*** «Магдалена зязюльку прысылае».
**31. а. Шэсць дзеў.** «Лён сей позні». **Фядот.** «Як на дубе апушка — у Фядота поўна аўса кадушка».

## ЧЭРВЕНЬ

**2. ч. *Ушэсце.** Абрад «Страла». **Тры пакутнікі.** «Няма лета, але пасля іх не бывае зімы».
**3. пт. Алёна.** Дзень ільну.
**4. сб. Васіліск.** «Ад Васіліска і салавей блізка».
**5. н. *Пяцідзясятніца*** (Спасланне Святога Духа). **Дзень Ефрасінні Полацкай.** Хадзілі ў Полацк пакланіцца і абракацца.
**7. а. Ян.** «Рой перад Янам — пчаляр будзе панам».
**8. с. *Градавая серада.**
**10. пт. *Сёмушныя Дзяды.**
**11. сб. *Духавая субота, Зялёная субота.** Свята маладой зеляніны. «Завівалі» вянкі, бярозкі.
**12. н. *Сёмуха, Тройца.** Культ продкаў і раслінасці. «Павядзём Куста пад гай зялёненькі...»
**13. п. *Святы Дух.** «На Святога Духа не скідай кажуха». Садзілі капусту і каноплі. *Русальніца, Іван ды Мар'я. Праводзіны вясны. «На Граннай нядзелі Русалкі сядзелі...». **Ерамей.** «Прыйшоў Ерамей — больш не сей». ***Антоній.*** «Антоні, аддай коні».
**14. а.** *Конскі Вялікдзень. Свята коней. **Юстын і Харытон.** «Юстын цягне ўверх каноплі, а Харытон — лён».
**15. с.** *Градабой, Серада Русаль. Здабывалі з ясеня святы агонь.
**16. ч. *Наўская Тройца, Абліваха.** Памінанне продкаў на магілках. **Лук'ян**. Паўднёвы вецер на Лук'яна — на добры ўраджай яравых.
**19. н.** *Русальчыны розыгры. Засцерагаліся рос. ***Пятроўскія запускі.** Развівалі вянкі. *Летняе сонцастаянне. Усход 4.37, захад 21.45. Поўня (14 — 20.06).*
**20. п. *Пятроўка, Петравіца. Пятроўскі пост** да 11 ліп. Пятроўка-галадоўка.
**21. а. Тодар.** «На Тодара раса — канапель паласа».
**22. с. Кірыла.** Пачыналі касавіцу ў Паазер'і.
**23. ч. *Дзявятнік.** Перавод уніятаў у праваслаўе. «Дзевяць ягодзін на галінцы». ***Ян Купальны.*** «Сонца грае». У старажытнасці — Новы год/лета.
**24. пт. *Дзевятуха.** Дзень засцеражэння ад навальніцы.
**25. сб. Анапрэй.** «Хто на Нупрэя пасее грэч, той будзе бліны печ».
**26. н. Акуліна Грачышніца.** Сеялі грэчку. Задзярыхвост. Каровы «зыкуюць».
**28. а. Амос.** «Прыйшоў Амос — цягне ўгору авёс».
**29. с. Ціхан.** «Пеўчыя птушкі заціхаюць». ***Пятрок.*** «Да Пятра зязюльцы кукаваці». «Прыйшоў Пятрок — апаў лісток, прыйдзе Ілья — ападуць і два».
**30. ч. *Дзясятнік.** «Дзясятнік гнаі возіць».

## ЛІПЕНЬ

**1. пт. *Дзясятка.** «Косы точыць». «Жыта паспявае».
**6. с.** Купалле. Свята Сонца і кахання. «Дзень адбаўленне, ночы прыбаўленне».
**7. ч. Іван Купала.** «Учора была Купала, а сёння Іван».
**8. пт. *Данат.*** «Святы Данат коскі точыць».
**10. н. *Самсон.*** «На Самсона дождж — сем тыдняў то ж». ***Сем братоў.*** «Сем братоў варожаць, колькі тыдняў пагоды».
**12. а. Пятро.** Свята заканчэння Купалля.
**13. с. Паўпятро.** Дзень талакі. **Сымон і Юда.** «На Сымана й Юды конь баіцца груды».
**14. ч. Кузьма і Дзям'ян.** Свята кавалёў. «Святы Пятро жыта спеліць, св. Кузьма сярпы робіць, а св. Дзям'ян сена грабе».
**17. н. Андрэй.** «Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма». «Андрэй усіх мудрэй».
**18. п.** Свята Месяца. «Месяц гуляе».
**21. ч. Казанская, Градавы дзень.** Засцераганне ад нябесных стыхій, ад хвароб вачэй і галавы. **Пракоп.** Пракоп бок прыпёк.
**25. п. *Якуб.*** «На Якуба хлеба поўна губа». **Прокл.** Засцерагаліся вялікіх рос.
**26. а. *Ганна.*** Снапы кладзе. **Гаўрылей.** Засцеражэнне ад граду.
**29. пт. Афінаген.** Заціхаюць птушкі. **Серпавіца, Шыпілінка** (пятніца перад Ільёю). Дзень «зазубрывання» сярпоў перад жнівом.

## ЖНІВЕНЬ

**1. п. Макрыны.** «Глядзі восень па Макрыні».
**2. а. Ілля.** Свята дажджоў і навальніц. «Ілля нарабіў гнілля». «Укінуў у ваду кусок ільда».
**4. ч. Мар'я.** «Магдалена — вады па калена».
**6. сб. Барыс,** «Барыс і Глеб — паспеў хлеб». **Палікоп.** Паліць копы.
**7. н. Ганны.** «Святы Ганны бабкі стаўляюць».
**9. а. Панцеляймон.** Сцаляў ад хвароб галавы.
**10. с. *Лаўрын.*** «На Лаўрына спяшай да млына».
**12. пт. Сіла.** Жыта сей.
**14. н. Макавей, Першы Спас.** Свята маку і мёду. **Спасаўка.** Пост да 27 жніўня.
**15. п. *Прачыстая, Зельная.*** «Прыйшла Прачыста — стала поле чыста». **Базыль.** «Базыль авечкам воўну дае».
**16. а. Антоны Віхравеі. Рох.** «Кірмаш на паненак» — дзень выглядання нявест.
**17. с. Еўдакія.** Агуркі збірае.
**19. пт. Яблычны Спас.** Свята садавіны.
**23. а. Лаўрэн** — свята млынара. «Баўтрамей і Лаўрын паказваюць, якая прыйдзе восень».
**24. с. *Баўтрамей.*** «Святы Баўтрамей высылае буслоў па дзяцей». «Прыйшоў Баўтрамей — жыта на зіму сей».
**27. сб. Міхей.** Выспяваюць брусніцы.
**28. н. Прачыстая, Зельная.** Свята ўраджаю.
**29. п. Трэці Спас.** Свята хлеба.
**30. а. Міроны Ветрагоны.** «Пыл па дарозе гоняць, па прыгожым леце стогнуць».
**31. с. Флор і Лаўр.** Свята коней. Арабінавыя дзень і ноч. Сухая навальніца, або дождж. **Ян.** «Ян на лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў».

## ВЕРАСЕНЬ

**5. п. Лупа.** «Сей на Лупа — будзе жыта купа».
**7. с. Баўтрамей.** «Жыта на зіму сей».
**8. ч. *Другая Прачыстая.*** «Меншая Прачыста — канчай сеяць начыста».
**10. сб. Мацей.** Абаронца ад п'янства.
**11. н. Калінавік, Іван Крываўнік.** «Да Яна прасіце, дзеткі, дажджу, а па Яне я й сам упрашу».
**13. а. Кіпрыян.** Журавель збіраецца ў вырай.
**14. с. *Узвіжанне.*** Закрыванне зямлі. **Сымон.** Абрад «жаніцьбы коміна». (Асенняе Навалецце/Наваголдзе з 1493 г.). Бабіна лета.
**19. н. Цуды, Міхал.** «Міхал з поля спіхаў».
**21. п. Багач, Нараджэнне Божае Маці.** Свята заканчэння ўборкі зерневых. Засідкі.
**24. сб. Тадора.** «На Тадору ўсякае лета заканчваецца».
**25. н.** *Асенняе раўнадзенства. Усход 7.01, захад 19.02. Зыход (маладзік з 26.09 па 2.10).*
**26. п. Стаўроўскія Дзяды**
**27. а. Звіжанне.** Свята закрывання зямлі на зіму. Гадзюкі збіраюцца ў кучу.
**29. ч. *Міхал*.** «Калі на Міхала з поўначы вецер вее, то не май на надвор'е надзеі». **Сіцыян.** «Святы Сацыян ды ляны пасцілаў».

## КАСТРЫЧНІК

**2. н. Зосім.** Журавіны на Зосіма ўздымаюцца — мароз на Пакровы ўдарыць.
**3. н. Астап, Астаф'я.** Прыкметы па ветру.
**4. а. *Пранцішак, Францішак.*** «На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка».
**8. сб. Сяргей.** «З Сяргея пачынаецца зіма». Жалезны тыдзень. Чысцілі жалезныя рэчы.
**9. н. Іван Шаптун, Іван Кураед, Багаслоў.** Шапталіся свахі пра нявест. «Іван Багаслоў дружкі разаслаў, а на Пакрова дзеўка гатова». «Святы Багаслоў да буракі капаў». (Поўня да 16.10).
**14. пт. Пакровы, Трэцяя Прачыстая.** Вясельная пара. «Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку — вяночкам». «Пакровы — зарыкалі каровы». «Калі на Пакрову маладзік, то будзе лёгкая зіма. З поўначы вецер — халодная зіма, з поўдня — цёплая». Дзявоцкае лета (да 21.10). Прымалі «ў дзеўкі» сяброўак.
**21. пт. Трыфан, Палагея.** «Золкім ветрам вее». ***Зміцер.*** «Да Змітра баба хітра».
**25. а. Марцін** — свята млынароў. Частаваліся гусяцінай на млынавым крузе. «Марцін святы — любіцель гагаты».
**28. пт. *Сымон і Юда.*** «Сымон з Юдаю працу ў полі канчаюць, хаты аглядаюць». ***Параскева Пятніцкая.*** Забарона на прадзенне.
**29. сб. Лонгін.** Збавіцель ад хвароб вачэй.
**31. п. Лука.** «Хто сее да Лукі, не будзе мець ні хлеба, ні мукі». Дзень іканапісцаў. ***Юльян*** — ахоўнік дзяцей.

## ЛІСТАПАД

**1. а. *Усе святыя.***
**2. с. *Задушны дзень.*** Памінальны дзень.
**4. пт. Казанская.** «Да Казанскай — не зіма, а пасля — не восень; зранку дождж, з вечара — снег. Выязджай на Казанскую на калёсах, а палазы з сабой прыхапі».
**5. сб. Асяніны, Змітраўскія Дзяды.** «Святыя дзяды, завём вас...».
**8. а. Зміцер.** «Да Змітра дзеўка хітра». Канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе.
**9. с. *Тодар.*** «На Тадора поўна камора».
**10. ч. Параскі.** Апякунка жанчын і рукадзелля.
**11. пт. Настуся.** Настуся стрыжэ авечкі. ***Марцін.*** «Мядзведзь кладзецца ў бярлогу».
**12. сб. Артошка.** Пачатак прадзення.
**14. п. Кузьма-Дзям'ян.** Апякун земляробства, кавалёў і вяселля.
**21. п. Міхайлаў дзень.** Абаронца ад грому. «Мядзведзі ідуць у спячку». «Міхайла ў інею — снежная зіма наступае, а калі туманамі спавіты — быць адлізе» (такія ж прадказанні і на Матрону).
**22. а. Матрона.** «З Матроны становіцца зіма».
**24. ч. Хвёдар Студзянец.** «Хвёдаравы вятры галоднымі ваўкамі скуголяць».
**25. пт. *Кацярыны.*** «Кацярына забрала лета». **Іван Міласцівы.** Дзень падарункаў.
**27. н. *Адвент.* Юстыніян.** Апякун плоднасці і дзяцінства. **Піліп.** Пярэдадзень **Піліпаўскага посту.**
**28. п. Піліпаўка** — перадкалядны пост (да 06.01).
**29. а. Мацей.** «На Мацея зіма пацее».
**30. с. *Андрэйкі.*** Дзявочае свята.

## СНЕЖАНЬ

**4. н. *Адвент. Барбара.*** «Барбара ноч урвала, а дзень надтачыла». **Увядзенне.** Водзяцца ваўкі.
**5. п. Пракоп. *Савы.*** «Барбара мосціць, Сава цвікі войстрыць, а Мікола прыбівае».
6. а. ***Мікола.*** «Хвалі зіму па Міколе». **Матрыхваны.** Не пралі.
**7. с. Кацярыны.** «Забрала край лета».
**9. пт. Юр'е Зімовы.** Юра мосціць. ***Ганны***. «Ад Ганны да Каляд два тыдні і два дні».
**11. н. *Адвент.***
**13. а. Андросы, Андрэйкі.** Варажылі.
**14. с. Навум.** «Наставіць на вум». Пачыналі вучыць дзяцей грамаце.
**17. сб. Варвары.** «Мікола і Варвара ноч урвалі».
**18. н. *Адвент. *Савы.*** «Сава мосце, а Мікола гвоздзе».
**19. п. Мікола Зімовы.** «Без Міколы не бывае ні зіма, ні лета». «Мікола марозам гвоздзіць».
**22. ч. Ганны.** «Ганны — прыбавіцца багата дня». «Ганкі — палічаны дзянькі».
**23. пт.** *Зімовае сонцастаянне. Усход 9.27, захад 16.50. Маладзік у 13.16.*
**24. сб. *Посная куцця.***
**25. н. *Божае Нараджэнне. Пачатак Каляд*** (да 6 студз.). Было Новым годам. «Свята Ражаства ўпярод пашло, Новы гадок павёў радок». **Спірыдон Сонцаварот.**
**26. п. *Сцяпан.*** Дзень найму батракоў у мінулым. «На Святы Сцяпан кожны сабе пан».
**31. сб. *Багатая куцця. Сільвестр.*** Варажылі дзяўчаты. **Марк.** «Марка да Варка — няхай будзе парка».

**Алесь ЛОЗКА, фалькларыст.**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор электронных торгов,
Оператор электронной торговой площадки)
**извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества**
**ОАО «Управление механизации №91» (Продавец)**

## Лот № 040122001:

Грузовой специальный автокран LIEBHERR LTM 1160-5.1, кузов (рама) W09585200EEL05360.

Начальная цена с НДС – 1 879 530,00 руб.
Задаток – 187 953,00 руб. Обременения: залог.
Шаг аукциона – 18 795,30 руб.
Местонахождение: г. Минск, ул. Бабушкина, д. 17.
Штраф – 30 000,00 руб.

**Электронные торги состоятся 28.01.2022 в 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»).**

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах, условиях участия, сроке подписания договора купли-продажи, условиях оплаты размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами **26.01.2022** в 11.00.

**Организатор электронных торгов:**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • www.торги.бел • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

**ЗАО «БелБанкротАукцион»**,
организатор торгов по продаже имущества
**ОАО «Дятловоремстрой»** (УНП 500056186),
объявляет о проведении **24.01.2022 г. в 09.00**
публичных торгов в электронной форме
на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке:** https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/01/spisok-imushhestva_dyatlovoremstroj_torgi_24.01.22.pdf

**Местонахождение имущества:** г. Дятлово, ул. Советская, д. 73.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

**Продавец:** ОАО «Дятловоремстрой», тел. +375293923903.

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **21.01.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 12.01.2022** по **17.00 21.01.2022** на bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре; аукционный сбор по недвижимости – 2 % от цены реализации предмета торгов; по лоту № 3 – 7 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

---

**ЗАО «БелБанкротАукцион»**,
организатор торгов по продаже имущества
**ОАО «Барановичская СПМК-2»** (УНП 200167456),
объявляет о проведении **24.01.2022 г. в 09.00**
публичных торгов в электронной форме
на электронной торговой площадке bankrottorg.by

**Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке:** https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/01/imushhestvo-baranovichskaya-pmk_torgi-24.01.22.pdf

**Местонахождение имущества:** г. Барановичи, ул. Вильчковского, д. 184.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

**Продавец:** ОАО «Барановичская СПМК-2», тел. +375293923903.

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере **5 %** от начальной стоимости лота не позднее **21.01.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с **9.00 12.01.2022** по **17.00 21.01.2022** на bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре; аукционный сбор: по недвижимости – 2 % от цены реализации предмета торгов; по остальным лотам – 7 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и порядок оплаты (условия оплаты): для лота 01 (недвижимость) – в течение тридцати календарных дней со дня проведения аукциона; для остального имущества – в течение пятнадцати календарных дней со дня проведения аукциона.

---

Центр Промышленной Оценки
**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «МЗОР», г. Минск, ул. Октябрьская, 16** |

**Предмет аукциона**
**Месторасположение – г. Минск, ул. Октябрьская, 16**

**Лот № 1**

Производственная база в составе: **производ. корпуса** (1130,5 кв. м, 500/С-49698; 4340,5 кв. м, 500/С-53224), **диспетчерская** (54,7 кв. м, 500/С-53818), **здание специализир. иного назначения (литейный цех)** (7664,8 кв. м, 500/С-47329), **компрессорная** (473,6 кв. м, 500/С-54017), **электропечь термическая** (39,8 кв. м, 500/С-54018), **здание весовой** (24,3 кв. м, 500/С-54019), **административно-хоз. корпус** (2323,4 кв. м, 500/С-49697, составные части: проезды, площадки, подкран. путь, дорожки, подпор. стены, бордюры, ограждения, ворота, калитка, лестница), **склад** (2328,4 кв. м, 500/С-53297), **склады** (895,5 кв. м, 500/С-53808), **склады, гаражи** (453,6 кв. м, 500/С-53897), **склады, администрат. помещения, агрегатные** (563,7 кв. м, 500/С-53846), **инженерный корпус** (3348,6 кв. м, 500/С-46093), **административно-производ. корпус № 4** (19710,5 кв. м, 500/С-53638), **склад** (2193,5 кв. м, 500/D-708019487), **строительный цех** (507,9 кв. м, 500/С-53845), **насосная станция автоматич. пожаротушения** (194,4 кв. м, 500/С-54016), **станция очистки сточных вод** (305,1 кв. м, 500/С-54015), **градирня** (39,1 кв. м, 500/С-55130), **ливневая канализац. сеть** (1077,5 м, 500/С-1029279), **хозяйственно-питьевая водопров. сеть** (973,2 м, 500/С-1029266), **тепловая сеть** (236,7 м, 500/С-1029272). **Иное имущество, входящее в состав лота:** газопровод внутрицеховой (инв. № 12050078), внеш. электроснабжение складского корпуса (инв. № 12020054), внутриплощадочные кабельные сети (инв. № 12020085), токопровод из алюминиевых шин 3-4 корп. (инв. № 12080111), площадка для складирования песка (гравий инв. № 11010193), склад баллонов с кислородом (инв. № 10020854), склад для хранения баллонов с аммиаком (инв. № 10020280), склад металлический (инструмент) (инв. № 10020810), склад макулатуры (инв. № 10020877), оборудование РП-2 (инв. № 13041173), конденсат. установки (инв. № 13041182, 13040277, 13040260, 13040159, 13040165), трансформатор силовой (инв. № 13041169), ТП (инв. № 13040099, 13040120), комплекты ТП (инв. № 13040082, 13040053, 13040030), комплект. распред устройство 6КВ (инв. № 13040024), конденсат. установка низ.напр. (инв. № 13040188), лифты груз. (инв. № 28240022, 28240013, 28240065, 28240036, 28240059, 28240042), лифт грузопас. (инв. № 28240071), объекты растительности: береза бородавчатая (инв. № 20054010), вишня, 4 шт. (инв. № 20054002), груша (инв. № 20010005), яблоня (инв. № 20054008), липа мелколистная, 3 шт. (инв. № 20054005), газоны, 10 шт. (инв. № 20050404)

***Сведения о земельном участке**:* предоставлен продавцу для размещения объектов иного назначения на праве временного пользования пл. **5,1481 га (**срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на земельный участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0134 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,5680 га), канализации (пл. 0,1920 га), теплоснабжения (пл. 0,0420 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0024 га), недвижимых матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,5035 га)

**Обременения по лоту № 1:** площади зданий частично сданы в аренду. Здания с инвентар. номерами 500/С-53224 (лот № 1), 500/С-46093 (лот № 1) находятся в залоге у банков. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.
На территории лота № 1 расположено защитное сооружение гражданской обороны, которое не входит в состав лота.
Покупатель одновременно с подписанием договора купли-продажи недвижимости заключает с Продавцом предварительный договор аренды на часть капитального строения инв. № 500/С-49698 (комната № 4 (подстанция) 33,6 кв. м, и комната № 5 (подстанция) 52,0 кв. м). Договор аренды Покупатель обязуется заключить с Продавцом в течение 2 рабочих дней с момента перехода права собственности на объект недвижимости. С предварительным договором о заключении договора аренды части капитального строения можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 28 099 616,16 бел. руб.**

**Лот № 2**

Производственная база в составе: **заводоуправление** (2763,5 кв. м, 500/С-53298, составные части: проезд, дорожка, площадки, ограждение, бордюры), **производ. корпус** (13365,7 кв. м, 500/С-45217), **технологич. котельная** (200,30 кв. м, 500/С-53824), **тепловая сеть** (43,8 м, 500/С-1029271), **ливневая канализац. сеть** (547,1 м, 500/С-1029280), **хозяйственно-бытовая канализац. сеть** (161,3 и 169 м, 500/С-1029273, 500/С-1029277), **хозяйственно-питьевая водопров. сеть** (68,4 и 295,1 м, 500/С-1029269, 500/С-1029267). **Иное имущество, входящее в состав лота:** внутриплощад. каб. сети (инв. № 12020084), комплект. ТП (инв. № 13040065), конденсат. установка низ. напр. (инв. № 13040194), конденсат. установки (инв. № 13040294, 13040283, 13040171), шкафной газорегуляторный пункт (инв. № 11010728),низковольт. конденсат. установка (инв. № 13040225), токопровод из алюминиевых шин 1 корп. (инв. № 12080109), насосное оборудование АБК инв. № 28620483), электротехн. обор. АБК инв. № 13041331), комплект. трансф. подстанция инв. № 13040076), контейнер универсальный 1СС инв. № 25021204Д), склад металлический (веники) инв. № 10020802), низковольт.конденсат. уст-ка инв. № 13040202), склад пропан-бутан, инв. № 10020144), телефон. канализ. и смотр. устр. инв. № 12030041), забор из сетки рабицы инв. № 11010800), склад металлический (для электрокары), инв. № 10020825), внутриплощадочные сети связи инв. № 11010562 и № 12030035), АТС БЕТА М5 №1749 ТАИС.465235.012-02 (инв. № 25020008), объекты растительности: клен серебристый, 5 шт. (инв. № 20054001), каштан конский (инв. № 20054004), липа мелколистная, 2 шт. (инв. № 20058473), туя западная, 5 шт. (инв. № 20054006), газоны, 2 шт. (инв. № 20058579)

***Сведения о земельных участках,*** предоставленных продавцу для размещения объектов иного назначения:
1) на праве временного пользования пл. **1,94 га (**срок действия по 31.08.2029). ***Ограничения (обременения)*** прав на зем. участок: расположен в водоохран. зоне; в охран. зона линий связи и радиофикации (пл. 0,0268 га), в охран. зонах электрич. сетей (пл. 0,0339 га), зонах сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,4485 га), канализации (пл. 0,1234 га), теплоснабжения (пл. 0,0322 га), объектов газораспределит. системы (пл. 0,0975 га), недвиж. матер. историко-культур. ценностей (пл. 0,3730 га);
2) на праве долевой аренды (срок действия по 31.03.2026) для размещения технологич. котельной пл. **0,0991 га** с ограничениями

**Обременения по лоту № 2:** площади зданий частично сданы в аренду. Здание с инвентар. номером 500/С-53298 находится в залоге у банка. Более подробную информацию по залогу и арендаторам можно узнать у организатора аукциона.
Продавец гарантирует освобождение Капитального строения (Производственный корпус) инв. № 500/С-45217 в течение 36 месяцев

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 19 257 564,00 бел. руб.**

**Обременения по лотам:** в соответствии с градостроит. проектом детального планирования, на зем. участках, на которых расположены предметы аукциона, предусмотрено размещение объектов торгово-развлекат., выставочно-музейного, музейно-просветит. назначения

**Задаток 1 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **0,07 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) дней после проведения аукциона.
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **16.02.2022 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **14.02.2022 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.**
**www.cpo.by. E-mail: auction@cpo.by**

---

**ЗАО «БелБанкротАукцион»**, организатор торгов по продаже имущества УП «Пинская СПМК-5» (УНП 200111234), объявляет о проведении **15.02.2022 г.** с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона.

Предмет торгов:

| № лота | Наименование имущества (предмет торгов) | Начальная стоимость, бел. руб. (без НДС) | Сумма шага аукциона, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. | Минимальная цена, бел. руб. (без НДС) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Автокран АБКС-5 на базе МАЗ 5334, г.в. 1986, 7394 БНЛ, VIN № 90982 | 6300,50 | 315,03 | 630,05 | 5600,45 |
| 2 | Автомобиль ZIL 131, г. в. 1984, AI 5206-1, VIN №552154 | 3825,31 | 191,27 | 382,53 | 3400,27 |
| 3 | **Объеденный лот. Сети (3 шт.) + Автокран (2 шт.) + Станок. Состав:** | **126167,19** | **6308,36** | **12616,72** | **113550,47** |
| | Тепловая сеть, инвентарный номер 130/С-48983 | 17687,60 | | | 15918,84 |
| | Водопроводная сеть, инвентарный номер 130/С-49032 | 656,97 | | | 591,27 |
| | Канализационная сеть, инвентарный номер 130/С-49033 | 1187,60 | | | 1068,84 |
| | Грузовой специальный автокран КС-55727-1 на базе МАЗ 630303, г. в. 2010, рег. № АЕ 2891-1, VIN МАЗ № М630303А0003130, VIN КС-55727-1 № Y3M557271A0001324 | 57105,68 | | | 51395,11 |
| | Грузовой специальный автокран КТА-18 на базе KAMAZ 65115, г. в. 2008, рег. № АВ 2946-1, VIN KAMAZ № XTC65115382332449, VIN КТА-18 № Y6918013080B37119 | 38660,04 | | | 34794,04 |
| | Четырехсторонний станок GRIGGIO G240/6 с инвентарным номером 000979 | 10869,30 | | | 9782,37 |

**Местонахождение имущества:** Брестская обл., г. Пинск, ул. Рокоссовского, д. 4А.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296569865, Виктор.

**Продавец:** УП «Пинская СПМК-5».

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **14.02.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **12.01.22** по 17.00 **14.02.22** на bankrottorg.by. К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде, по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 120,00 бел. руб., равными частями по каждому лоту; за оценку по каждому лоту № 1, 2 – 315,53 бел. руб., лот № 3 – 1189,88 бел. руб.; стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре; аукционный сбор по лотам №№ 1, 2 – 5 % от цены реализации имущества, по лоту № 3 – 4 % от цены реализации имущества.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 10 (десяти) календарных дней с даты проведения электронных торгов.

---

**ИЗМЕНЕНИЕ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ от 04.09.2020 № 101 (3463), опубликованную в газете «Минский курьер», по объекту «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными объектами общественного назначения и обслуживания в границах ул. Семашко – ул. Петровщина. Санкт-Петербургский квартал в г. Минске». 1-я очередь строительства. Жилой дом «Маяк» по г. п. № 1, жилой дом «Парус» по г. п. № 2.1, многоуровневая гараж-стоянка по г. п. № 4.1»**

Стоимость строительства 1 кв. м общей площади квартир для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей:
3-комнатные (1-й этаж, площадь 86,8 – 103,72 кв. м) – 2500 белорусских рублей;
3-комнатные (17-й этаж, площадь 130,11 – 130,45 кв. м) – 2550 белорусских рублей.

Объект долевого строительства – квартира с машиноместом.
Стоимость строительства машиноместа – 24 613,16 белорусского рубля.
Условия оплаты – **единовременно** в течение 10 (десяти) календарных дней.
Документы для заключения договоров создания объектов долевого строительства будут приниматься и регистрироваться в ходе личного приема и в порядке живой очереди с 8.30 18 января 2022 года по адресу: г. Минск, ул. С. Есенина, д. 6, офис 213 (офис продаж).

УНП 192400611

Лёсы людскія

# УСЁ ПАЧАЛОСЯ Ў БАЦЬКОЎСКІМ ДОМЕ... З ГАРМОНІКА

**Так здараецца: нехта з маленства хоча стаць лётчыкам ці тым жа бухгалтарам і пасля школы адразу паступае вучыцца, атрымлівае дыплом, працуе па абранай прафесіі... Аднак ці не часцей на ўступных экзаменах здараюцца непрыемнасці: не хапае, напрыклад, балаў, і...**
**Само жыццё падштурхоўвае да іншага выбару, іншага жыццёвага шляху, часам — не менш цікавага. Сведчанне таму — лёс Кацярыны Канцэр.**

Пасля школы гэтая дзяўчынка марыла стаць доктарам, здавала экзамены ў Гродзенскі медінстытут, але для таго каб паступіць, ёй не хапіла бала — толькі аднаго.

Можна было пачакаць і налета паспрабаваць яшчэ раз, але...

Дома, у Драгічыне, сядзіба Канцэраў заўжды была месцам «сходак»: у вольную часіну тут збіралася шмат людзей. Яны спявалі, танцавалі, жартавалі, і мама Кацярыны загадзя расчыняла вокны, каб іншыя таксама чулі, як хораша іграе гармонік і спявае моладзь, хацела, каб у людзей была радасць...

А таму, параіўшыся з бацькамі, дзяўчына вырашыла «несці яе ў народ» — пайшла вучыцца на культработніка, і не прагадала — яшчэ і таму, што падчас вучобы сустрэла сваё каханне, выйшла замуж за аднакурсніка Аляксандра Шэшку, разам з ім па размеркаванні прыехала працаваць у Столін.

Тады пры мясцовым Доме культуры было шмат розных мастацкіх калектываў, яркіх выканаўцаў. Маладая пара многаму там навучылася і амаль адразу ж... адышла ад спраў: Аляксандра прызвалі ў войска, Кацярына пераехала да яго бацькоў у вёску Міжлессе Бярозаўскага раёна. Тут нарадзілася іх дачушка Эліна.

Гадаваць дзіця маладзенькай маме дапамагала свякроў Валянціна Палікарпаўна. Яна ж расказвала нявестцы пра мясцовыя звычаі, знаёміла з людзьмі. Не дзіва, што хутка гэтую сям'ю наведалі дырэктар школы Мікалай Сіліч і старшыня мясцовага калгаса Мікалай Агароднік. Яны запрасілі Кацярыну працаваць — весці ў школе ўрокі спеваў, а ў вёсцы — ствараць самадзейнасць.

Прапанова была прывабная, і Каця пачала дзейнічаць. Вакол сябе яна сабрала шмат аднадумцаў, якія перш-наперш навялі парадак у клубе, потым сталі запрашаць туды настаўнікаў, сельскую моладзь, вучняў, адкрываць мясцовыя таленты. На гармоніку цудоўна іграў Іван Пастаялка, на цымбалах і скрыпцы — браты Грыцкі, людзі не зводзілі вачэй з танцора Уладзіміра Амялюсіка...

Не дзіва, што ў хуткім часе калектыў тамтэйшай мастацкай самадзейнасці не проста ўзяў удзел у раённым аглядзе-конкурсе, але і перамог. Яму было прысуджана першае месца і ўручана радыёла «Беларусь».

Пасля гэтага Кацярыну запрасілі працаваць у Бярозаўскі аддзел культуры — спачатку метадыстам, потым — дырэктарам метадычнага цэнтра.



Кацярына ШЭШКА каля Бярозаўскага Палаца культуры.

Менавіта ў тыя часы быў створаны калектыў «Памяць сэрца», у які ўвайшлі ветэраны вайны Марыя Логінава, Дар'я Пятрова, Іван Панюціч, Міхаіл Юрчанка, Мікалай Галаганюк, Якаў Буры, Фёдар Ерш ды іншыя.

Тых, хто пачынаў, сёння ўжо няма — справу працягваюць ветэраны працы. Іх клубу «Памяць сэрца» дзесяць гадоў таму было прысвоена званне «народны», ён жа стаў лаўрэатам рэспубліканскіх фестываляў «Беларусь — мая песня» і «Не старэюць душой ветэраны»... Што, між іншым, чыстая праўда, бо апошнім часам гэты калектыў у самых розных аўдыторыях і месцах правёў больш за 300 выступленняў, якія нязменна завяршаліся шчырымі апладысментамі, адрасаванымі не толькі выканаўцам, але і кіраўніку.

...Кацярына Шэшка лічыць сябе шчаслівай жанчынай. Яна мае вялікую дружную сям'ю, якая цяпер жыве ў Бярозе, часта наведвае і свой родны Драгічын. Праўда, у бацькоўскім доме цяпер ніхто не жыве, але ён дагледжаны і, магчыма, помніць яшчэ, як тут іграў-заліваўся гармонік, з-за якога жыццё дачкі склалася менавіта так, а не інакш.

**Іван Аскірка, фота аўтара.**

*г. Бяроза.*

Дзякуй!

# ЧЭРГАЎ — ЯК НЕ БЫЛО

**Да пошты ў мяне асаблівае стаўленне. І віною таму... «Звязда», якую выпісваю гадоў мо з трыццаць. І гадоў мо з дваццаць як пішу — «вясёлыя і праўдзівыя гісторыі», подпісы да здымкаў, лісты...**

Амаль заўсёды, калі снегу намяце ды калі разводдзе, думаю, ці праб'ецца да нас паштовая машына, ці прынясе паштарка Наталля Сусло свежы нумар «Звязды»?

Тут яшчэ і дарожнікам дзякуй — чакаю я нездарма: газета прыходзіць. Чытаючы яе, з цеплынёй і часта ўспамінаю Святлану Мікалаеўну Зайцаву — былога начальніка Рагачоўскага вузла паштовай сувязі. Да выхаду на заслужаны адпачынак яна і сабе выпісвала «Звязду», і сваёй маме. А якія ладзіла дні падпісчыка!... Можна сказаць, сапраўдныя святы — з гасцямі, з падарункамі-сувенірамі... Я добра ведаю гэта, бо не раз прысутнічала, не раз выступала.

Але ж цяпер пра іншае. У нашай вёсцы Лучын каля 900 чалавек насельніцтва. Раней тут быў цэнтр сельсавета, на пошце працавала тры чалавекі — загадчыца і дзве паштаркі. Потым так званая старая гвардыя сышла, а пры новай — амаль заўжды былі чэргі. Трэба аплаціць камунальныя паслугі, нешта адправіць, купіць тыя ж канверты, календары, нешта з прадуктаў ці прамысловых тавараў — загадзя псуецца настрой, бо ведаеш, што прыйдзецца альбо пачакаць, змарнаваўшы свой час, альбо вярнуцца ні з чым...

Так было, пакуль загадчыцай пошты не стала Дзіна Рыгораўна Сяргеева. Маладая жанчына, але вопыт работы ў яе ўжо быў, прычым немалы. Так што асвоілася яна досыць хутка, і чэргаў у нас як не было! Нават калі сыдзецца шмат людзей, усіх абслугоўваюць хутка, ветліва і на здзіўленне спакойна, бо з Дзінай Рыгораўнай, каб і хацеў, пасварыцца немагчыма. Яна да ўсіх з павагай і ўвагай... Да таго ж вёска — не горад, дзе ніхто нікога не ведае. У нас, у Лучыне, людзі дакладна жывуць па правілах сваёй супольнасці. Гэта значыць, калі нехта спяшаецца, Дзіна Рыгораўна абслужыць без чаргі, і людзі зразумеюць. Ці, здараецца, нехта прыпазніўся... Праблемы ў яго таксама не будзе: чалавека абслужаць за кошт перапынку на абед.

А таму шчыры дзякуй кіраўніцтву вузла паштовай сувязі за такога спецыяліста і чалавека! І, вядома ж, самой Дзіне Рыгораўне за яе работу і павагу да людзей.

Ад імя жыхароў вёскі Лучын —

**Соф'я Кусянкова,**
*Рагачоўскі раён.*

Размінка для кемлівых

# Вакол радзільнага дома...

Не так даўно, у снежні, мы адсвяткавалі Дзень беларускага кіно і, напэўна ж, згадалі многія беларускія фільмы. Веданне іх прапаную праверыць з дапамогай адмысловай віктарыны. Для таго каб расшыфраваць пералічаныя ў ёй кінастужкі, дастаткова словы ў назвах замяніць (у асноўным) на процілеглыя па значэнні. Калі гэта атрымаецца, можна ўспомніць прозвішчы рэжысёраў. Такім чынам:

1. «Садовая казка». 2. «Машыніст паравоза». 3. «Палескі нарыс». 4. «Першая зіма сталасці». 5. «Кароткія цалі міру». 6. «Бяду можна знішчыць». 7. «Зялёныя карані». 8. «Вакол радзільнага дома». 9. «Рамесніца і кампазітар». 10. «Стой і слухай». 11. «Чорная шэрань». 12. «Губіцелі гора». 13. «Аддам сваю асалоду». 14. «Бацькі вяртаюцца з бяседы». 15. «Хвастаты пралом». 16. «Белая сасна».

**Адказы:** 1. Юрый Тарыч «Лясная быль». 2. Барыс Шадурскі «Кіроўца аўтобуса». 3. Барыс Сцяпанаў «Альпійская балада». 4. Валерый Рубінчык «Апошняе лета дзяцінства». 5. Аляксандр Карпаў «Доўгія вёрсты вайны». 6. Іосіф Шульман «Шчасце трэба берагчы». 7. Уладзімір Корш-Саблін «Чырвонае лісце». 8. Віктар Тураў «Цераз могілкі». 9. Самсон Самсонаў «Гандлярка і паэт».10. Элем Клімаў «Ідзі і глядзі». 11. Ігар Дабралюбаў «Белыя росы». 12. Уладзімір Корш-Саблін «Шукальнікі шчасця». 13. Міхаіл Пташук «Вазьму твой боль». 14. Віктар Тураў «Сыны ідуць у бой». 15. Пётр Васілеўскі «Рагаты бастыён». 16. «Віталь Чацверыкаў «Чорная бяроза.

**Мікалай Старых,** *г. Гомель.*

Спявай душа!

# «ПАСЯРЭДЗІНЕ ЗІМЫ КАЛЯДУ СВЯТКУЕМ МЫ...»

**І, як сведчыць рэдакцыйная пошта, дастаём звязду (сімвал сонца — шматпрамянёвую, асветленую знутры зорку на кіі), пераапранаемся ў казу, жорава ды мядзведзя, бяром гармонік — і выпраўляемся па хатах, офісах, кватэрах, каб павіншаваць сваіх родных, суседзяў, дзелавых партнёраў са святамі... У дапамогу калядоўшчыкам нізка прыпевак ад чытачоў «Звязды».**

***

*На Каляды кожны ласы*
*На гарэлку і каўбасы.*
*Каму надта павязе,*
*Той да дзеўкі дапаўзе!*

***

*Наступае Каляда —*
*Цякуць грошы, як вада.*
*Хай пустуе гаманец,*
*Але ж свету не канец!*

**Эльяш Банель,**
*г. Мінск.*

***

*Як удзень на Каляду*
*Зноў дастанем мы звязду,*
*З цыганамі, з жоравам*
*Пагуляем здорава!*

***

*Як не можаш заспяваць*
*Ці мядзведзем зарыкаць,*
*Абярніся п'яніцам —*
*Хоць сто грам*
*дастанецца!*

**Мікалай Касмачэўскі,**
*г. Наваполацк.*

***

*Калі ў вас пад Новы год*
*Хлеба ні кавалачка,*
*Сабярыце карагод —*
*Будуць хлеб і чарачка!*

***

*Каб жылося ўсім шчасліва,*
*П'ём гарэлачку і піва.*
*Бог жа шчасцейка дае —*
*Хто працуе, а не п'е.*

*Ой, браточкі, дайце рады:*
*Едзе ўнучак на Каляды.*
*Сябрукоў сваіх вязе:*
*Гаспадарку ўсю звяздзе!*

***

*За народзіны Хрыстовы*
*Выпіць мы заўжды гатовы.*
*Было б добра, калі б Бог*
*Потым «выжыць» дапамог.*

**Іван Астроўскі,**
*г. Мінск.*

***

*На Каляды кожны ласы*
*На гарэлку і каўбасы.*
*Хто бяднейшы, хто багаты —*
*Усе шануюць гэта свята!*

***

*Наступае Каляда —*
*Цякуць грошы, як вада.*
*Пасля святаў застанецца*
*На стале адна «Звязда»!*

***

*На стале абрус калядны,*
*Сена пад абрусам.*
*Хай шанцуе ў новым годзе*
*Людзям-беларусам!*

**Антаніна Ерамеева,**
*Рагачоўскі раён.*

Пласты гісторыі

# СТАЯНКА ВЯРБЛЮДАЎ

## Статуі ў Саудаўскай Аравіі аказаліся самымі старажытнымі



**Навукоўцы ўстанавілі ўзрост гіганцкіх рэльефных малюнкаў, высечаных у скалах на стаянцы вярблюдаў на поўначы Аравійскага паўвострава. Статуі жывёлін, выкананыя ў натуральную велічыню, былі ўзведзены яшчэ ў эпоху неаліту, у VI тысячагоддзі да нашай эры. Такім чынам яны могуць быць найбольш старажытнымі падобнымі аб'ектамі. Вынікі работы размешчаны ў часопісе Journal of Archaeological Science Reports.**

Рэльефныя выявы размешчаны на тэрыторыі дагістарычнага помніка пад назвай «Стаянка вярблюдаў». Увогуле археолагі «ўбачылі» на скалах 21 рэльеф з выявамі вярблюдаў і іншых жывёлін. Раней навукоўцы меркавалі, што скульптуры былі ўзведзены 2000 гадоў таму, аднак дакладныя даныя невядомыя.

Спецыялісты з Міністэрства культуры Саудаўскай Аравіі, а таксама Універсітэта караля Сауда сумесна з нямецкімі калегамі з Інстытута гісторыі чалавецтва Макса Планка і Нацыянальнага цэнтра навуковых даследаванняў Францыі арганізавалі маштабнае даследаванне, нацэленае на вызначэнне ўзросту помніка.

Было ўстаноўлена, што статуі стварылі ў VI тысячагоддзі да нашай эры з выкарыстаннем каменных прылад. У той час на тэрыторыі помніка размяшчаліся саванападобныя лугі з азёрамі і асобна стаячымі дрэвамі. Непадалёк вадзіліся дзікія коні і вярблюды.

Паводле ацэнкі экспертаў, для ўзвядзення кожнай скульптуры патрабавалася 10-15 дзён работы. Лічыцца, што над помнікам шчыравала вялікая група людзей. Даследчыкі мяркуюць таксама, што большая частка рэльефаў была створана да канца VI тысячагоддзя да нашай эры. Гэта сведчыць аб тым, што дадзеныя помнікі могуць быць самымі старажытнымі буйнымі рэльефнымі статуямі ў свеце, якія захаваліся.

Здароўе на талерцы

# «ЭЛІКСІР МАЛАДОСЦІ»

## Навукоўцы назвалі найлепшую дыету для даўгалецця

**Амерыканскія навукоўцы з Інстытута Бака па даследаванні старэння раскрылі сістэму харчавання, якая дапаможа істотна павялічыць працягласць жыцця, піша Express.**



Спецыялісты папярэдзілі, што залішняе спажыванне вугляводаў стварае вялікую метабалічную нагрузку на арганізм. Акрамя таго, павышаны ўзровень цукру можа пагражаць атлусценнем, запаволеннем абмену рэчываў, сардэчна-сасудзістымі захворваннямі, высокім крывяным ціскам і нават ракам. Таму навукоўцы лічаць, што для даўгалецця лепш за ўсё прытрымлівацца нізкавугляводнай дыеты. Яны назвалі яе «эліксірам маладосці».

Найлепшым варыянтам нізкавугляводнага харчавання, па словах біёлагаў, з'яўляецца кетагенная, або кета-дыета — сістэма харчавання з высокім утрыманнем тлушчаў і малой колькасцю вугляводаў. Адзначаецца, што дадзены рацыён дапамагае захаваць памяць, рухальныя функцыі і павялічыць працягласць жыцця. Акрамя таго, кета-дыета станоўча ўплывае на людзей з дыябетам другога тыпу.

Разам з тым важным правілам для падтрымання даўгалецця навукоўцы назвалі ўжыванне раслінней ежы. Даследаванне з удзелам добраахвотнікаў паказала, што такое харчаванне на 16 працэнтаў зніжае рызыку развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Каго мы бачым!

# ПОЗІРК З МІНУЛАГА

## Даследчыкі аднавілі твары трох старажытнаегіпецкіх мумій

**Рысы твараў трох муміфікаваных мужчын, якія жылі каля дзвюх тысяч гадоў таму, атрымалася ўзнавіць дзякуючы узорам іх ДНК. Пра гэта гаворыцца ў артыкуле навуковага партала Live Science.**



Па звестках выдання, мужчыны памерлі ва ўзросце 25 гадоў у перыяд паміж 1380 годам да нашай эры і 425 годам нашай эры. Іх муміі выявілі ў старажытнаегіпецкім горадзе Абусір эль-Мелек, размешчаным на поўдзень ад Каіра.

Навукоўцы з Інстытута навукі гісторыі чалавецтва імя Макса Планка ў нямецкім Цюбінгене атрымалі матэрыял згаданых мумій яшчэ ў 2017 годзе. Але толькі цяпер супрацоўнікі амерыканскай кампаніі па ДНК-тэхналогіях Parabon NanoLabs стварылі 3D-мадэлі гэтых мужчын.

Пры аднаўленні рысаў твару даследчыкі выкарысталі тэхналогію ДНК-фенатыпавання, іншымі словамі, спрагназавалі фізічныя характарыстыкі людзей на аснове аналізу іх генетычнага матэрыялу.

Мяркуючы па аднаўленых мадэлях, ва ўсіх траіх мужчын была светла-карычневая скура, цёмныя вочы і валасы. Пры гэтым генетычна яны аказаліся бліжэйшыя да сучасных жыхароў Міжземнамор'я і Блізкага Усходу, чым да сучасных егіпцян.

Па словах дырэктара Parabon па біяінфарматыцы Элен Грэйтак, тэхналагічны падыход, адпрацаваны на старажытных муміях, можа дапамагчы навукоўцам аднавіць твары для ідэнтыфікацыі сучасных астанкаў.

Тэхналогіі будучыні

# ПЕННАЯ «ПУШКА»

## Запатэнтаваны новы спосаб барацьбы з ляснымі пажарамі

**Расійскае навукова-даследчае і вытворчае прадпрыемства «Маскоўскі інстытут цеплатэхнікі» знайшло спосаб тушэння лясных пажараў з дапамогай ракетных тэхналогій, запатэнтаваўшы «пушку» для тушэння, вынікае з дакументаў, размешчаных у базе даных Распатэнта.**

«Вынаходства адносіцца да сферы пеннага пажаратушэння і прызначана для прадухілення і тушэння буйнагабарытных пажараў у цяжкадаступных мясцовасцях», — вынікае з тлумачэння да патэнту. Акрамя таго, «пушку» будуць выкарыстоўваць для стварэння загараджальных палос у працэсе ліквідацыі лясных верхавых і нізавых пажараў.



Навізна спосабу тушэння ў тым, што адмысловы састаў для ўтварэння пены змешчаны ў водны раствор. Такім чынам пена фарміруецца не адразу, а актывуецца з часам. Улічваючы што далёкасць палёту пены меншая, чым у струменя вадкага раствору, прапанаваны спосаб аўтары лічаць больш «дальнабойным», ён дазваляе тушыць пажары на большай адлегласці.

У прыладзе рэалізаваны ракетны прынцып работы, які Маскоўскі інстытут цеплатэхнікі выкарыстоўвае для вытворчасці ракет на цвёрдым паліве. У сістэме пажаратушэння цвёрдапаліўныя элементы падпальваюцца і прадукты іх гарэння выціскаюць водны раствор з бака, гэта значыць «страляюць» ім у патрэбным кірунку.

Варта нагадаць, што пажары ў Расіі могуць пабіць антырэкорд XXI стагоддзя: полымя знішчыла лес амаль на 16 мільёнах гектараў тэрыторыі краіны.

Біялогія з анатоміяй

# УНУТРАНЫ ГАДЗІННІК

## Агучаны бяспечны для сэрца час класціся спаць

**У Вялікабрытаніі навукоўцы правялі даследаванне і высветлілі, што калі засынаць у перыяд з 22 да 23 гадзін, зніжаецца рызыка атрымаць сардэчна-сасудзістыя захворванні. Пра гэта гаворыцца ў артыкуле, апублікаваным у часопісе European Heart Journal — Digital Health.**

Удзел у эксперыменце ўзялі 88 тысяч чалавек, на запясці якіх для дакладнасці выяўлення даных былі надзеты спецыяльныя акселерометры. Сярэдні ўзрост паддоследных склаў 61 год. Супрацоўнікі кампаніі Huma Therapeutics вялі назіранні на працягу сямі дзён, фіксуючы таксама фізічны стан і сацыяльнае становішча назіраных.

«У нашым арганізме ёсць унутраны гадзіннік, які называецца цыркаднымі рытмамі, што дапамагаюць рэгуляваць фізічнае і разумовае функцыянаванне. Занадта ранні ці позні час наступлення сну можа парушыць работу біялагічнага гадзінніка, што прывядзе да неспрыяльных наступстваў для здароўя сардэчна-сасудзістай сістэмы», — каза аўтар даследавання доктар Дэвід Плэнс.

Эксперты ацэньвалі здароўе ўдзельнікаў выпрабавання за апошнія шэсць гадоў і выявілі развіццё сардэчна-сасудзістых захворванняў у 3,6 працэнта чалавек. Даследчыкі прыйшлі да высновы, што тыя людзі, якія засынаюць апоўначы ці пазней, на 25 працэнтаў больш схільныя да рызыкі развіцця хвароб сэрца і сасудаў, чым тыя, хто кладзецца спаць у перыяд з 22 да 23 гадзін. Да захворванняў сэрца ў такім разе больш схільныя жанчыны. Сярод мужчын рызыка была высокая толькі для тых, хто засынаў раней за 22 гадзіны.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**



# ВЯРТАННЕ Ў КРАЙ, ШТО «ЎСКАРМІЎ НАТХНЕННЕ»

## Ліст на трыццаць тры старонкі

**У лістападзе 1998 года на адрас Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва прыйшла нечаканая пасылка са Злучаных Штатаў Амерыкі. Невялікі пакунак утрымліваў матэрыялы, звязаныя з жыццём мастака Ахола-Вало: некалькі выставачных каталогаў, фінскую газету Pohjois Karjala («Паўночная Карэлія») за 29 жніўня 1987 г. з вялікім ілюстраваным артыкулам вядомай фінскай журналісткі і пісьменніцы Туулы-Ліiны Варыс, значная частка якога прысвечана беларускаму перыяду жыцця і творчасці Ахола-Вало, успаміны бібліёграфа Зоры Кіпель пра сустрэчу з мастаком у 1988 г. у Хельсінкі і некаторыя іншыя.**

Самай вялікай нечаканасцю ў гэтым пакунку быў ліст мастака (дакладней — яго чарнавік) да беларуска-татарскага грамадска-культурнага дзеяча і літаратуразнаўцы Мацея Канапацкага, які жыў на Беласточчыне. Ліст напісаны па-беларуску, пісаўся на працягу амаль двух тыдняў, ад 27 сакавіка да 7 красавіка 1957 года (кожны дзень працягу ліста аўтарам пазначаны), і мае трыццаць тры вялікія рукапісныя старонкі. З яго зместу зразумела, што ініцыятарам перапіскі быў Канапацкі — актыўны дзеяч і арганізатар многіх беларускіх праектаў.

### «Паважаны друг беларускай культуры!»

Для Ахола-Вало знаёмства з Канапацкім прынесла вялікую радасць і спадзяванні на тое, што ён зноў уключыцца ў плынь беларускага жыцця, хоць бы на Беласточчыне, бо шлях у СССР яму быў закрыты. І ён піша да яго неверагодны па аб'ёме ліст, адгортваючы старонку за старонкай свайго жыцця, як сведчанне сваіх заслуг перад беларускім народам. Аўтар паслання прыадкрывае многія таямніцы як уласнай біяграфіі, так і далёкіх падзей культурнага жыцця ў Віцебску і Мінску 1920-х гадоў. Ён напоўнены каштоўнай для даследчыкаў фактalогіяй, успамінамі з далёкіх часоў, філасофскімі адступленнямі, бытавымі сцэнамі бягучага жыцця і бясконцымі выказваннямі сімпатыі і ўдзячнасці да Беларусі. Ужо сам пачатак ліста гаворыць пра многае: *«Паважаны друг беларускай культуры! ...Увесь дзень учора і гэту ноч знаёміўся з даўнімі мастацкімі працамі, рэгістраванымі ў маёй хроніцы, якая пачата з 1910 года. Я пачаў выдзяляць з яе ў асобны спісак тыя творы, якія маюцца ў маіх архівах і што захаваліся ад «зубоў воўка злытнасці» цяжкіх часоў гісторыі. У плыні гэтай працы, вакол пачатай вялікай справы, я зноў пачуў, крок за крокам, тыя знаёмыя цудоўныя гукі цымбал і вясковых жалеек, мяккі говар працалюбівых людзей і ўсе ласкаючыя гукі таго края, які як матка, калісь даўно ўскарміў маё натхненне і гадаваў маё пачуцце да мастацкага шляху і сагрэў мяне. У гэтыя гадзіны і хвіліны я зноў усё больш і больш вяртаюся да былых маіх вялікіх думак аб дапамозе ўзмацавання культуры любага для майго сэрца беларускага народу».*

### Вясна Александэры

Выдатны фінскі мастак-графік, пісьменнік і мысляр Александэры Ахола-Вало нарадзіўся 27 студзеня 1900 года ў вёсцы Імпілахці (цяпер Рэспубліка Карэлія) ў сям'і фінскага пісьменніка і журналіста Петэры (Пека) Ахола (1875—1919). Пасля заўчаснай смерці жонкі ў 1902 г. Петэры з сынамі пераехаў у Пецярбург, дзе прайшлі самыя раннія дзіцячыя гады будучага мастака. Пасля падзей 1905 г., за ўдзел у рэвалюцыйных выступленнях, Петэры Ахола з сям'ёй быў высланы ў Вырыцу пад Пецярбургам. У горад дзяцінства Александэры вернецца ў 1915 г., каб вучыцца у мастацкай школе. Тут ён пачне захапляцца філасофіяй, псіхалогіяй, але найбольш рэвалюцыйнай рамантыкай. Праз некалькі гадоў ідэі сусветнай рэвалюцыі скіруюць яго ў рады Чырвонай Арміі, а пасля і дабравольцам у паход на Варшаву.

Значную частку свайго жыцця Александэры Ахола-Вало пражыў у Швецыі. Былі ў яго біяграфіі, акрамя Санкт-Пецярбурга, Адэса, Масква, іншыя гарады. Але былі перыяд у цэлых дзесяць гадоў, які ён называў *«вясной жыццёвай і мастацкай школы, вясной радаснай і ўпартай працы на карысць беларускай культуры»*. У беларускі горад Віцебск Ахола-Вало першы раз прыехаў у 1920 г. Прыехаў, можна сказаць, выпадкова: быў накіраваны далечвацца пасля ранення. Ехаў са спакойным сэрцам. Віцебск маляваў у сваім уяўленні паводле расказаў бацькі — удзельніка Першай сусветнай вайны, якога лёс закінуў на Віцебшчыну і які вельмі добра адзываўся аб беларусах і распавядаў сваім дзецям пра цудоўны край. Гаварыў, што *«беларускі народ чакае вялікая будучыня за тыя вялікія выпрабаванні, якія гэты народ праходзіў на працягу ўсёе свае гісторыі»*. *Пра свой першы дзень у Віцебску Ахола-Вало ўспамінаў: «Чыгуначны служыцель увайшоў у вагон і стаў у дзвярах каля мяне і крыкнуў з усёй сілай усяму шчыльна запакаванаму насельніцтву вагона: «Віцебск!» Сонейка бліскучае асляпіла вочы, калі я выйшаў з памяшканняў халоднага і паўцёмнага вакзала на плошчу. Пайшоў далей з радасным захапленнем да ўсяго новага. Ішоў доўга па шматлюднай вуліцы (гэта была Вакзальная вул.), пакуль не дайшоў да моста праз раку Дзвіну. Тутака я ўбачыў цудоўную карціну. Па мосце ішлі людзі шэрагамі з лапатамі, тапарамі і рознымі зброямі працы і дружна пяялі. Гэта быў дзень вялікага суботніка. Стаў я каля агароджы моста, паклаў катомак ля ног і пачаў рысаваць фарбавымі алоўкамі гэтае з'явішча. Я зрабіў некалькі хуткіх наброскаў, а народ усё ішоў і ішоў з новымі чырвонымі штандарамі і лозунгамі».*

У Віцебску Ахола вельмі хутка і актыўна ўключыўся ў мастацкае жыццё. На той час гэты горад быў цэнтрам гуртавання мноства творчых плыняў, што вельмі хутка дадуць сусветнаму мастацтву імёны Марка Шагала, Казіміра Малевіча, Роберта Фалька, Івана Пуні, Веры Ермалаевай, Эль Лісіцкага і іншых. Менавіта ў год прыезду Ахола ў Віцебск існаваўшай тут народнай мастацкай школе надаецца статус вышэйшай пад назвай Віцебскія дзяржаўныя мастацкія майстэрні, якія ў 1921 г. стануць Віцебскім мастацка-практычным інстытутам (ВМПІ). Магчыма, што і ён стаў студэнтам ВМПІ, хоць гэты факт пакуль што застаецца спрэчным. Вядома, што ўладкаваўся на работу мастаком-выхавацелем у адну з віцебскіх школ, наведваў заняткі ў майстэрні Пэна, Юдовіна, асвоіў майстэрства афорта і лінагравюры. Віцебск пакінуў у 1923 г. і экстэрнам здаваў экзамены ў Адэскім мастацкім вучылішчы. Якраз гэтая акалічнасць і можа сведчыць аб тым, што Ахола быў студэнтам ВМПІ. Вядома, што з верасня 1923 г. інстытут быў рэарганізаваны ў тэхнікум. Гэтае рашэнне стала пачаткам вялікага ўнутранага канфлікту, які прывёў да таго, што многія выкладчыкі пакінулі навучальную ўстанову, а з імі і некаторыя вучні, што пасля працягнулі вучобу ў Маскве, Ленінградзе і іншых гарадах. Магчыма, што адным з гэтых вучняў быў і Ахола.

### Мінскі прамень жыцця

У Мінск Ахола прыехаў у 1925 г. Тут да свайго прозвішча ён далучыў прыстаўку-псеўданім Вало, што ў перакладзе з фінскай азначае Святло ці Прамень. Ён ужо дастаткова добра авалодаў беларускай мовай, стаў заўважнай фігурай у мастацкім асяродку, займеў шмат сяброў і прыхільнікаў, якія ў друку і ў штодзённым жыцці называлі яго Алесь Ахол ці Алесь Пятровіч. Да таго ж ён паспеў стварыць сям'ю, ажаніўшыся з беларускай Аленай Нікановіч-Яцкевіч, і ў Мінску ў іх нарадзіліся дзве дачкі. Яго мінскі перыяд быў вельмі плённым. У лісце да



Канапацкага ўласнаручна сцвердзіў: *«Галоўнае, што колькасць выкананых прац у Беларусі з'яўляецца да сённяшнага дня найбольшай часткай усёй колькасці, што выканана мною за ўсю дзейнасць, нягледзячы на тое, што хутка 27 год часу з моманту, як я пакінуў гэты духоўна мне родны край».* Добра знаёмыя ўсім часопісы і газеты «Узвышша», «Малады араты», «Піянер Беларусі», «Чырвоная змена», «Савецкая Беларусь», «Звязда» ў 1920-я гг. выходзілі менавіта ў яго афармленні. У Мінску праявіўся яго талент і ў галіне кніжнай графікі. У бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва і іншых бібліятэках краіны можна ўбачыць многія выданні 1920-х гг. у афармленні Ахола: «Новую зямлю» Якуба Коласа, «Табе» Анатоля Вольнага, «Плынь» Міхайла Грамыкі, «Угрунь» Андрэя Александровіча, «Хвоі гавораць» Кузьмы Чорнага, «Ветры буйныя» Паўлюка Труса... Ён рабіў малюнкі для Белдзяржкіно, стварыў серыю партрэтаў беларускіх дзеячаў Баліцкага, Каспяровіча, Чарвякова і іншых. Мастак вёў дакладны ўлік сваіх работ і ў цытаваным тут лісце канстатуе: *«...з выкананых па заказу грамадскіх устаноў колькасць прац была ў Беларусі — 2453 і аднаАлічнікаў — прыватных заказаў 362».*

Мінскі перыяд вызначыўся для мастака яшчэ і тым, што кнігі Беларускага дзяржаўнага выдавецтва ў яго афармленні, побач з прызнанымі беларускімі мастакамі Дваракоўскім, Гуткоўскім, Тычынам, Змудзінскім, у 1927 г. былі паказаны на Сусветнай выстаўцы кніг у Парыжы. У Мінску Ахола-Вало стварыў вялікую колькасць гравюр, якія пабывалі на міжнародных выстаўках і яго першай персанальнай, адкрытай у Мінску ў 1928 годзе. У 1927 г. па ініцыятыве мастака арганізуецца творчая суполка «Прамень», задача якой была абазначана ўласна Ахола-Вало — фарміраванне новага рэвалюцыйнага асяроддзя агітацыйнымі сродкамі скульптуры, дэкору, лозунгаў. У 1930 г. Ахола-Вало распрацоўвае і будуе ў Мінску на тэрыторыі Першай усебеларускай сельскагаспадарчай і прамысловай выстаўкі «Павільён гісторыі пакутаў чалавецтва». На насценных росписах павільёна былі адлюстраваны вядомыя зверскія спосабы катаванняў. Пасярод павільёна стаяла гіганцкая шасціметровая драўляная скульптура «Галіяф» са светлавой панэллю на спіне, на якой наведвальнік мог прачытаць гісторыю вядомых пакутнікаў. Манокль гіганта асвятляў усю плошчу выстаўкі. Павільён прастаяў да 1941 г. і быў знішчаны фашысцкімі захопнікамі.

### Не толькі сведчанні радасці

1930 год быў апошнім беларускім годам у жыцці Ахола-Вало. Яго ліст да Канапацкага раскрывае некаторыя прычыны яго рашэння пакінуць Мінск. *«Хранікальныя*



«Мінск, вуліца Мала-Татарская».

*памяткі-архівы і мемуары захавалі не толькі сведчанні радасці тых далёкіх гадоў, якія зрабілі грунт майго развіцця, але і сведчанні гора. Найбольш было гора ў апошнім 1930 годзе майго прабывання ў Мінску і наогул у Беларусі, калі ў мяне больш не хапала сіл змагацца з ворагамі культуры. Кепска ўсім прыходзіцца тады, калі культурнымі справамі кіруюць сляпыя ворагі культуры. Тады было многа людзей, якім снілася толькі ўлада над другімі ды асабістая карысць. Справы культуры такім чынам у большасці былі ў руках непрагрэсіўных людзей. Дзякуючы гэтаму ў тыя часы было загублена шмат светлых ідэй. Ааднымі лозунгамі не дасягнеш такога цуду, каб у адзін момант усё перамянілася. Дзеля гэтага патрабуецца больш упартай працы ва ўсіх галінах, якімі павінна кіраваць толькі навука са спецыяльнымі навуковымі калектывамі, а не прынцыповая сістэма кіравання, скапіяваная з мінулых сістэм грамадскасці».* Найбольшыя пакуты прынесла мастаку нападкі на «Прамень», а пасля і канфлікт з-за нявыплачанага абяцанага ганарару за пабудову згаданага тут павільёна. І ён прымае рашэнне пераехаць у Маскву.

Там Ахола-Вало працаваў у Інстытуце аховы сям'і і дзяцінства, распрацоўваў праект «зялёнага пояса Масквы», але ў хуткім часе адчуў зласвеснае дыханне набіраўшых ход рэпрэсій. Па парадзе старога бальшавіка Карла Радэка ў 1933 г. мастак выехаў у Фінляндыю, пры гэтым змог вывезці не толькі сям'ю, а і свой багаты архіў. Пасяліўся ў Хяменліна і некалькі гадоў плённа працаваў. Калі ў 1939-м пачалася савецка-фінская вайна, быў западозраны фінскімі ўладамі ў сувязях з НКУС і арыштаваны. Некалькі месяцаў правёў у турме. У 1940 г. змог выехаць у Швецыю, дзе пражыў больш за сорак гадоў. У Фінляндыю вярнуўся толькі ў 1982 годзе.

### Апошняя вандроўка ў краіну юнацтва

Пішучы ліст да Канапацкага, Ахола-Вало спадзяваўся і марыў пра выстаўку беларускай часткі сваіх твораў. *«Галоўнае, каб гэта думка аб выставе вытварылася і каб мела месца яшчэ пры маім жыцці сярод беларусаў. Я жадаю ўбачыць гэту радасць як вышэйшую ўзнагароду за тое, што будучы адарваным ад Беларусі на доўгія часы, застаўся верным ёй»,* — пісаў ён.

Ахола-Вало памёр 15 верасня 1997 года. І ўсё ж у канцы жыцця яму пашчасціла ажыццявіць сваю запаветную мару вярнуцца ў краіну юнацтва, прайсціся па яе трывожных сцежках і здзівіць усіх добрым валоданнем беларускай мовай. Вяртанне яго імені ў беларускае мастацтва, як і апошні, адзіны яго прыезд у Беларусь пасля 1930 г., адбылося дзякуючы стараннямі вучоных Адама Мальдзіса і Людмілы Налівайкі. У 1995 г. Ахола-Вало ўзяў удзел у Другім міжнародным кангрэсе беларусістаў, які праходзіў у Мінску, прачытаў даклад-успамін пра беларускі перыяд сваёй творчасці, увесь час паўтараючы: «Мая дарагая, родная Беларусь». У гэтыя ж дні ў Віцебску была зладжана яго выстаўка, якую ўбачыў сам мастак. 110-годдзе нараджэння Александэры Ахола-Вало — Алеся Ахола-Вало ў 2010 годзе Беларусь адсвяткавала вялікай выстаўкай яго твораў у Нацыянальным мастацкім музеі...

